ШКОЛА
Ў БЕЛАРУСКІХ
ТВОРАХ 8

САКРЭТЫ
ЎДЗЕЛЬНІКАЎ
ПАЎМАРАФОНАЎ 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

4 ВЕРАСНЯ 2021 г. СУБОТА № 170 (29539)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Пошук і падрыхтоўка кадраў, якія будуць даводзіць інфармацыю да грамадзян, — гэта галоўныя задачы таварыства «Веды» на найбліжэйшы час. Перавагу неабходна будзе аддаваць выкладчыкам вышэйшых навучальных устаноў. Таксама таварыства павінна выканаць адну з ключавых роляў у асвятленні гістарычнай тэматыкі, выпрацоўцы падыходаў супраць фальсіфікацыі гісторыі Беларусі».

ПРАЎДЗІВАЕ, АДКАЗНАЕ І СУМЛЕННАЕ РОДНАЕ СЛОВА

Удзельнікам і гасцям Дня беларускага пісьменства

Паважаныя сябры!

Шчыра вітаю гасцей і ўдзельнікаў Дня беларускага пісьменства.

Сёлета, у Год народнага адзінства, свята праводзіцца на прыгожай Капыльшчыне, дзе нарадзіліся многія знакамітыя дзеячы Беларусі.

У жыцці народа літаратура заўсёды была найважнейшым сродкам пазнання свету і выхавання асобы. Творчасць Максіма Багдановіча, Івана Шамякіна, Кандрата Крапівы, Івана Мележа і іншых айчынных пісьменнікаў і паэтаў, юбілеі якіх будуць адзначаны падчас форуму, з'яўляецца невычэрпнай крыніцай нацыянальнага гонару.

Дзякуючы нашым славутым класікам і новаму пакаленню таленавітай і патрыятычнай моладзі мы зберагаем гістарычную памяць беларускага народа, усталёваем у грамадстве яго галоўныя каштоўнасці — сумленнасць, справядлівасць, талерантнасць, павагу да чалавека працы і вялікую любоў да роднай зямлі.

Праўдзівае, адказнае і сумленнае роднае слова — залог кансалідацыі грамадства, на падмурку якога мы зможам і надалей паспяхова будаваць незалежную, моцную і квітнеючую краіну.

Жадаю ўсім удзельнікам і гасцям свята добрага здароўя, творчага натхнення, жыццёвай мудрасці і аптымізму.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота Аліны МАЗАВЕЦ.

КАРАТКА

- **Пасля праверак КДК 15 найменняў імпартных мыйных сродкаў забаронены да ўвозу і продажу ў Беларусі.**
- Дарэвалюцыйны будынак у Шумілінскім раёне ператворыцца ў майстэрню мастацкай керамікі.
- **Вакцына «Спадарожнік Лайт» паступіла ў Беларусь.**

- Першы фестываль вогненных мастацтваў Burnt Out пройдзе ў Віцебску 4 верасня.
- **Асобныя катэгорыі грамадзян змогуць выязджаць за мяжу наземным транспартам раз на тры месяцы.**
- Сталічная міліцыя будзе патруляваць вуліцы горада на сегвеях. Учора першы нарад, які ажыццяўляў патруляванне вуліц Мінска, выйшаў у горад на сегвеях.
- **Беларускія валейбалісты саступілі італьянцам у стартавым матчы чэмпіянату Еўропы.**

Круглы стол

ПІСЬМЕННІК — АСОБА, ЯКАЯ АБ'ЯДНОЎВАЕ КРАІНЫ

5 верасня ў Капылі адбудзецца ўрачыстае адкрыццё Дня беларускага пісьменства. Але мерапрыемствы свята пачаліся яшчэ да гэтай даты. 3 верасня ў Мінску адбыўся традыцыйны міжнародны круглы стол, які сёлета прайшоў пад назвай «Пісьменнік і адзіная гуманітарная прастора». На сустрэчу ў Палацы Рэспублікі запрасілі творчую інтэлігенцыю — пісьменнікаў, аналітыкаў і журналістаў. Беларускія эксперты круглага стала прысутнічалі вочна, а вось прадстаўнікі іншых краін далучыліся да гаворкі дзякуючы анлайн-трансляцыі. Адзначым, што сустрэча атрымалася сапраўды інтэрнацыянальнай: сярод замежных гасцей былі жыхары Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Малдовы... Усяго да трансляцыі далучылася 15 краін.

СТАР. 4

Фота Канстанціна ДРОБАВА.

Журналісцкае расследаванне

СТРАСЦІ ПА МОСЦЕ

Ці праўда, што ў Наваполацку, дзе жыве каля 100 тысяч чалавек, з-за закрыцця на капітальны рамонт адзінага моста праз Заходнюю Дзвіну на дарогах калапс для аўто і пешаходаў? Карэспандэнт «Звязды» праверыў і ўпэўніўся, што ўсё спазнаецца ў параўнанні.

СТАР. 6

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У НАС ЁСЦЬ УСЁ, А ВЯЛІКАГА СПОРТУ НЯМА»

Прэзідэнт адкрыў дзіцяча-юнацкі спартыўны цэнтр ФК «Дынама-Мінск»

Новы футбольны цэнтр пачынае працаваць пасля маштабнай рэканструкцыі, якая вялася з 2011 года. На абнаўленне комплексу, якое завершана летась у чэрвені, затрачана амаль 20 мільёнаў рублёў. Цяпер спартыўны комплекс мае тры палі са штучным пакрыццём і асвятленнем, трыбуны на пяць тысяч гледачоў, пункты харчавання, гасцінічныя нумары, пакоі допінг-кантролю, залу прэс-канферэнцый, вучэбныя класы і трэнажорны зал.

На базе спартыўнага цэнтра месяцца дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву «Акадэмія футбола ФК «Дынама-Мінск». Тут займаюцца 370 дзяцей ва ўзросце ад 5 да 18 гадоў.

Як ПВТ не дынаміць «Дынама»

Яго гісторыя пачалася ў 2000 годзе са стадыёна «Дарыда», які праз некалькі гадоў перайшоў ва ўласнасць клуба «Дынама-Мінск». Але састарэлае поле, відаць, не змагло натхняць дынамаўцаў на перамогі. Таму ў 2011 годзе пачалася маштабная рэканструкцыя поля. Першы этап завяршыўся ў 2019 годзе ўвядзеннем кацельняў, участка газаправода, інжынерных сетак і здачай трох футбольных палёў. А ў маі 1920-га, дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, падрадная арганізацыя «Мінскпрамстрой» давяла рэканструкцыю да пераможнага фіналу.

«Футбольны клуб «Дынама-Мінск» сёння — гэта асноўная каманда, дубліруючы склад, жаночая каманда і акадэмія футбола.

Няпростая сітуацыя была і з фінансаваннем дзейнасці клуба. «Футбольны клуб «Дынама-Мінск» — закрытае акцыянернае таварыства. 48,8 % долі належыць дзяржаўнаму грамадскаму аб'яднанню «Беларускае фізкультурна-спартыўнае грамадства «Дынама», 46 % акцый мае галоўнае ўпраўленне спорту і турызму Мінгарвыканкама. Сярод акцыянераў таксама — «Белавія» і «Белтэлекам».

Стабільную дзейнасць клуба дапамагла забяспечыць падтрымка «Адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій». Яна пагасіла даўгі, якія засталіся пасля спынення фінансавання клуба групай кампаній «Трайпл», узмацніла каманду гульцамі і дапамагла завяршыць рэканструкцыю футбольнага цэнтра. Ды і сёння ПВТ — асноўны спонсар клуба.

Прэзідэнт пацікавіўся, які сярэдні заробак у дынамаўца?

«Ад чатырох да пяці тысяч долараў па старых кантрактах», — кажа генеральны дырэктар ФК «Дынама-Мінск» Андрэй Талмач.

«Прынята пастанова, дзякуючы якой максімальная зарплата будзе да васьмі тысяч рублёў», — дадае міністр спорту Сяргей Кавальчук.

Аляксандр Лукашэнка адзначае, што пасля пройгрышу нацыянальнай каманды па футболе камандзе Чэхіі, а маладзёжнай зборнай — камандзе Ісландыі яму вельмі цяжка размаўляць са спартыўнымі функцыянерамі.

«Трэба было, каб пасля ўчарашніх гульняў, асабліва маладзёжкі, каб я вас нават не бачыў. ***Я не разумею, навошта вы ўвогуле спартсменаў выпусцілі на поле? Яны ж выйшлі адпачыць. Мне соромна на іх было глядзець на фоне ісландцаў»***, — звярнуўся кіраўнік краіны да кіраўніка федэрацыі футбола Уладзіміра Базанава.

У 2020 годзе асноўны састаў каманды «Дынама-Мінск» займаў 6-е месца ў чэмпіянаце Беларусі. Сёлета пакуль ідуць на чацвёртым. Прэзідэнт у размове з кіраўніцтвам клуба арыентуе на траплянне ў тройку лідараў краіны.

«Калі вы не будзеце дасягаць выніку, не спадзявайцеся на фінансавую падтрымку. Парк высокіх тэхналогій я напружваць не буду. Яны гэтыя грошы пад клуб «Дынама» далі толькі таму, што я на іх націснуў. Калі вы не зоймеце сёлета трэцяе месца, грошы будзеце шукаць самі», — заяўляе Аляксандр Лукашэнка.

«Вы гуляеце для людзей, якія плацяць вам грошы»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця дзіцяча-юнацкага футбольнага цэнтра ЗАТ «Футбольны клуб» Дынама-Мінск».

«Я так разумею, на трыбунах і на полі прысутнічаюць гаспадары гэтага цудоўнага комплексу, імя якому Акадэмія нашага вядучага клуба. Вельмі хацелася б, каб гэты клуб быў вядучым», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Новы комплекс ён назваў храмам навукі ў футболе. «Чатырыста чалавек зусім маладых, маленькіх людзей, якія мараць быць хто Месі, хто Раналду. Можа, хто паўторыць поспех нашых ветэранаў, на што я вельмі спадзяюся», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт расказаў, што сам у дзяцінстве гуляў у футбол і амаль прафесійна ім займаўся. «Калі вы вырашылі гуляць у гэтую выдатную гульню, самую папулярную ў краіне і ва ўсім свеце, і ў вас перад вачыма зялёны колер (я маю на ўвазе долар ці руковы еўра), вы ніколі не станеце футбалістамі і спартсменамі. Вы павінны прыходзіць сюды, каб гуляць у футбол», — заўважыў ён. Кіраўнік дзяржавы паабяцаў, што на пачатковым этапе маладыя футбалісты атрымаюць матэрыяльнае ўзнагароджанне, каб нармальна жыць. Усё астатняе — за самімі футбалістамі.

«Будзеце гуляць — будзеце зарплату атрымліваць і ўсё астатняе. Не будзеце гуляць — будзеце неканкурэнтаздольныя. Выбачайце за шчырасць. Але глядзець на тое ўбоства, якое сёння дэманструе наш футбол, недапушчальна», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што мае на ўвазе не толькі матч адборачнага турніру чэмпіянату свету па футболе, дзе зборная Беларусі прайграла камандзе Чэхіі з вынікам 0:1.

«Спаць з мячом пад падушкай»

Звяртаючыся да маладых футбалістаў, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што тыя, хто жадае гуляць, павінны займацца гэтым кожны дзень з раніцы да вечара. І нагадаў параду знакамітага трэнера «Дынама-Мінск» і чэмпіёна СССР Эдуарда Малафеева, які вучыў футбалістаў спаць з мячом пад падушкай.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што ўсё залежыць ад трэнера. Спартсмен можа зрабіць усё, чаму яго навучыць і прымусіць рабіць трэнер. Няма трэнера, няма каманды, няма спартсмена. Таксама ён заўважыў, што ёсць вялікія пытанні і да спартыўных чыноўнікаў.

Кіраўнік дзяржавы пажадаў футбалістам быць патрыётамі сваёй краіны. «Вы не для мяне гуляеце. Вы гуляеце для людзей, якія плацяць вам грошы. Невялікія, а камусьці — вялікія, вы для іх гуляеце. Вы гуляеце для таго, каб задаволіць сваё жыццё. Жыццё спартсмена вельмі кароткае. Пасля 30 гадоў у нас ужо не спартсмен. Хоць тыя, хто хоча гуляць, яны гуляюць. Раналду 36 гадоў, Месі — 34. Усе ведаюць, але гэта адзінкі», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены: калі «Дынама-Мінск» будзе лідарам, і БАТЭ, і «Гомель», і «Шахцёр» будуць іншыя. «Яны не дазволяць «Дынама» быць першымі. А я хачу, каб вы былі першымі, каб вы, як паравоз, пацягнулі за сабой гэтыя футбольныя вагоны. Гэта ж ганьба, ну не можам мы гуляць у футбол так, як мы гуляем», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на спартыўныя рэзервы. Паводле яго слоў, калі не будзе рэзерву, не будзе футбола ў будучыні. «Дзейнічайце, працуйце, а дзяржава заўсёды вам акажа падтрымку і дапаможа. Але патрэбны вынік. Не будзе выніку — ніякай падтрымкі быць не можа», — канстатаваў ён.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што падрыхтоўка рэзерваў — гэта праблема ўсяго беларускага спорту. «У нас выдатна ўсё з фізкультурай, краіна фізкультурнікаў. У нас ёсць усё, а вялікага спорту няма. Дзе губляюцца хлопцы? І штурхаюць, і кідаюць, і скачуць і ўверх, і ўніз, і ў даўжыню. Як толькі асноўная каманда, дарослая, страцілі іх. Тут трэба шукаць праблемы і іх вырашаць. Выбудаваная ўся сістэма, толькі патрэбен вынік», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з гульцамі некалькіх пакаленняў «Дынама-Мінск». Спачатку — з асноўнай камандай клуба, а затым — з ветэранамі, якія кавалі славу клуба «Дынама-Мінск». У мерапрыемстве прынялі ўдзел чэмпіёны СССР — Ігар Бялоў, Міхаіл Вергяенка, Ігар Гурыновіч, Юрый Трухан, Эдуард Малафееў і іншыя легенды футбольнага «Дынама». Разам з вопытнымі спартсменамі і трэнерамі кіраўнік дзяржавы абмеркаваў стан сучаснага футбола, яго праблемы і шляхі вырашэння, перспектывы самай папулярнай гульні.

«Гэта мерапрыемства знакавае»

Пасля знаёмства з рэканструяваным цэнтрам прайшла нарада па пытаннях развіцця спорту ў Беларусі. Прэзідэнт адзначыў, што пасля паражэнняў нацыянальнай і маладзёжнай каманд меркаваў адмяніць сустрэчу.

Асноўнай тэмай размовы ў новым спартыўным цэнтры павінен быў стаць футбол, але запрасілі і кіраўнікоў вядучых, медаляёмістых федэрацый.

«Дзяржава ўкладвае вялікія грошы ў развіццё ўсіх відаў спорту. ***Усе вы, спартсмены, сядзіце ў асноўным на дзяржаўных плячах. Гэта, магчыма, адна з прычын, чаму ў нас не ўсё ладзіцца ў вялікім спорце. Залішне ўсім добра. Нікуды не трэба хадзіць, нікога прасіць, дзяржава ўсё забяспечыць»***,— падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што вынікаў ні ў футболе, ні ў хакеі, ні ў іншых відах спорту не відаць. У доказ і апошняя Алімпіяда ў Токіа.

«Лёгкая атлетыка правалена цалкам, у плаванні найлепшы вынік — дзесьці восьмае месца. Ледзь у фінал пралезлі. Чаго туды паехалі, што там рабілі? Ладна, дрэнна выступаеце, паглядзіце, як павялі сябе спартсмены?» — заўважыў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт абурыўся нахабнасці ФК «Дынама-Мінск»: больш чым 80 % грошай атрымліваюць ад ПВТ, пры гэтым 70 % усіх сродкаў ідзе на заработную плату. Не застаецца грошай на развіццё і ўтрыманне клуба.

«Я хацеў бы пачуць тлумачэнне: чаму ў вас 70 працэнтаў усіх грашовых паступленняў на клуб ішло на заробкі? Вы прыходзілі да мяне, ставілі пытанні — я ішоў насустрач», — заўважыў Прэзідэнт.

«Дзве з паловай было хакейнай пляцоўкі, і каманда неяк гуляла. Калі стала больш чым 30, хакея няма», — акцэнтуе ўвагу Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, усё пытанне ў трэнерах. «Трэнеры, дарагія кіраўнікі федэрацый, — гэта ваш хлеб». Прэзідэнт раіць спартыўным чыноўнікам ствараць сістэму ў відах спорту, а кожны трэнер павінен выдаваць некалькі таленавітых спартсменаў.

«Калі гэтага няма і няма выніку — значыць, няма трэнера», — акцэнтуе кіраўнік краіны.

Прэзідэнт адзначыў, што пасля Алімпіяды ў Парыжы праз тры гады і наракаць не будзе на каго, і папярэджвае, што правал (як у Токіа) недапушчальны.

Прэзідэнт дадае, што ў спорце павінна быць дысцыпліна, жаданне перамогі. Ён адзначае: соромна апраўдвацца перад народам, калі задаюць пытанне, навошта спартсменам плацяць грошы за дрэнныя вынікі.

Прэзідэнт падкрэслівае, што сам убачыў на спаборніцтвах таленавітую моладзь, выхаваннем якой неабходна займацца. «Народ павінен бачыць, што мы грошы патрацілі, а ён прынёс медаль з асноўных спаборніцтваў. Рыхтуйце іх. Але не забывайце, што ён сёння на вышыні, а заўтра можа ўпасці. Павінен быць другі эшалон, што будзе падмацоўваць, падтрымліваць. Выберыце два гэтыя ўзроўні і рыхтуйце іх, стварыце нармальныя ўмовы, выхоўвайце іх сапраўднымі патрыётамі, каб яны не думалі: колькі мне заплацяць за медаль. Яны павінны думаць пра тое, каб прынесці гонар краіне», — мяркуе кіраўнік дзяржавы.

Марыя ДАДАЛКА, Валерыя СЦЯЦКО.

Каментарый у тэму

Уладзімір БАЗАНАЎ, кіраўнік асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола», расказаў, што ў студзені гэтага года, падчас сумеснага пасяджэння калегіі Міністэрства спорту і турызму і выканкама федэрацыі футбола, створаны групы, якія распрацавалі канцэпцыю развіцця футбола да 2028 года.

«Асноўным кірункам з'яўляецца развіццё дзіцяча-юнацкага футбола. Для гэтага федэрацыя ўвяла новыя сучасныя спецыялізаваныя праграмы падрыхтоўкі юных футбалістаў па ўзроставых групах ад 6 да 17 гадоў», — паведаміў Уладзімір Базанаў.

Важным кірункам развіцця футбола, паводле яго слоў, з'яўляецца ўдасканаленне інфраструктуры з ухілам на рэгіёны. Значны штуршок гэтаму віду спорту дасць і будаўніцтва Нацыянальнага футбольнага стадыёна.

Ён адзначае, што адной з прычын няўдалага выступлення мужчынскай зборнай па футболе з'яўляецца засілле замежнікаў у нашым чэмпіянаце.

«Вымушаны канстатаваць, што няма дастатковай колькасці кваліфікаваных футбалістаў для прыцягнення ў нацыянальную зборную. Гэта вынік недастатковай работы ў клубах з маладымі гульцамі, з-за накіраванасці клубаў на імгненны вынік. Для дасягнення яго кіраўніцтва клубаў робіць выбар на карысць замежных ці больш вопытных гульцоў», — кажа Уладзімір Базанаў.

Пасля нарады з Прэзідэнтам **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК** у размове з журналістамі зрабіў высновы і падзяліўся планамі.

«Тыя вынікі, якія паказвае наша зборная і клубныя каманды, — гэта не той узровень, які ад футбола чакае краіна, народ і нашы заўзятары. Асноўная задача — сістэму, якая сёння ёсць, перазагрузіць. І ў першую чаргу трэба звярнуцца да дзіцячага футбола, да таго падмурку, што дае зорачак, якія ў будучыні становяцца таленавітымі, перспектыўнымі футбалістамі. Другая праблема — гэта падрыхтоўка трэнераў. Трэнеры сёння, напэўна, не валодаюць тымі ведамі, навыкамі і ўменнямі, якія павінны быць для таго, каб паказваць вынік. Таму наш універсітэт фізічнай культуры, Беларуская федэрацыя футбола павінны самым пільным чынам паглядзець на падрыхтоўку трэнераў, каб трэнер мог правільна выбудаваць работу з дзіцем», — расказаў міністр. Паводле яго слоў, рабіць гэта трэба ва ўсіх рэгіёнах. І акадэмія футбола, якая была адкрытая на базе клуба «Дынама-Мінск», — адзін з элементаў сістэмы, якая ўжо працуе.

Сяргей Кавальчук звярнуў увагу, што сёння дастаткова інфраструктуры для развіцця футбола ў краіне. У Беларусі працуе восем крытых футбольных манежаў, вялізная колькасць футбольных палёў добрай якасці.

«Нам трэба павярнуцца да методык, да работы трэнераў з дзецьмі. Апусціцца на ўзровень дзіцячага футбола і выбудаваць там работу. Калі яе выбудаваць правільна, вынік будзе», — упэўнены міністр. Для дасягнення ўсіх пастаўленых задач прынята канцэпцыя па развіцці футбола да 2028 года, гэта значыць, на два алімпійскія цыклы.

Сяргей Кавальчук расказаў, што на нарадзе з Прэзідэнтам ішла размова і пра Алімпійскія гульні ў Токіа.

«Сёння вынік, які мы маем на Алімпіядзе, не той, на які мы разлічвалі. Горш за свае магчымасці выступілі па веславанні на байдарках і каноэ, сучасным пяцібор'і, цяжкай атлетыцы, ад якіх мы чакалі лепшага выніку. Сёння трэба зрабіць перазагрузку, работу над памылкамі і паглядзець, з кім рухацца далей. Часу да Парыжа засталося вельмі мала — усяго тры гады. У спорце гэта вельмі маленькі этап», — падкрэсліў міністр спорту і турызму.

На парадку дня

ЖЫВА, ВОСТРА, КРЫТЫЧНА...

На IV пазачарговым з'ездзе дэлегатаў Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства «Веды» ў Мінску абмеркавалі прынцыпы развіцця арганізацыі і эфектыўныя фарматы ўзаемадзеяння з грамадзянамі, падсумавалі вынікі працы за 2018—2021 гады, прадставілі праект новага статута арганізацыі, а таксама абралі старшыню праўлення. Ім стаў вядомы ў краіне палітолаг, дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вадзім ГІГІН.

Фота БелТА.

У з'ездзе прынялі ўдзел кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка, выконваючы абавязкі старшыні таварыства «Веды» Валерый Барадзеня, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Вячаслаў Даніловіч, прадстаўнікі дзяржаўных органаў і арганізацый з розных рэгіёнаў Беларусі.

Адна з галоўных задач таварыства «Веды» — быць уключанымі ў актыўную інфармацыйна-прапагандысцкую работу ў грамадстве, адзначыў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар СЕРГЕЕНКА.**

— Для таго каб выконваць гэтую задачу ва ўмовах інфармацыйнай барацьбы, грамадзянам неабходна жывое слова, і патэнцыял дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Веды» ў рэалізацыі задуманага вельмі высокі. Можна па-рознаму ставіцца да дзейнасці таварыства. Я лічу, што яно неабходна краіне для работы з насельніцтвам. Паказальны прыклад: у мінулым годзе напярэдадні выбарчай кампаніі часта завітваў у рэгіёны, камунікаваў з насельніцтвам. Пытанняў практычна не было. Прайшлі выбары, адбыўся ўсплёск актыўнасці, і тыя ж людзі прыходзілі на сустрэчы з іншым настроем, з'явіліся пытанні. Яны ёсць і дагэтуль, і на іх неабходна даваць дакладныя адказы. Гэтым таксама будуць займацца лектары таварыства. Дэлегатам быў прадстаўлены праект абноўленага статута арганізацыі, які за месяц будзе дапрацаваны. Ёсць прапановы і Адміністрацыі Прэзідэнта, і новага кіраўніцтва аб'яднання, у тым ліку па пытаннях фінансавання. Будзем адпрацоўваць новую методыку, каб і ацэньваць працу людзей, і знайсці новае спалучэнне старых і новых форм работы.

Ігар Сергеенка адзначыў, што асноўныя задачы дзяржаўна-грамадскага аб'яднання на найбліжэйшы час — гэта пошук і падрыхтоўка кадраў, якія будуць даносіць інфармацыю да грамадзян. «Для мяне стала адкрыццём, што ў некаторых райвыканкамах не разумеюць ролю таварыства «Веды». Сітуацыю трэба мяняць, арганізацыя павінна стаць ім памочнікам. Сёння мы бачым актыўных і зацікаўленых людзей. Так, прагучала і крытыка — будзем працаваць».

У таварыстве «Веды» будуць рэалізаваны новыя кірункі работы. Аб гэтым падрабязна расказаў Вадзім Гігін ужо пасля таго, як на пасяджэнні новага саставу праўлення быў абраны старшынёй арганізацыі.

— «Веды» — гэта арганізацыя з велізарнай гісторыяй, знакавае аб'яднанне, якое ўнесла вялікі ўклад у папулярызацыю навукі і якое добра памятаюць людзі старэйшага пакалення. Магчыма, у апошнія гады яно было не такім прыкметным на нашым інфармацыйным полі. Таму Прэзідэнт паставіў канкрэтную задачу — каб таварыства стала адным з галоўных інструментаў данясення актуальнай грамадска-палітычнай, гісторыка-культурнай, навукова-папулярнай інфармацыі да грамадзян нашай краіны і нават шырэй — за межы Беларусі. Бо ва ўмовах гібрыднай вайны ў краіне ствараецца шмат негатыўных стэрэатыпаў. У нас ёсць лічбы, аргументы, ёсць што сказаць пра гэта людзям. Упэўнены, што дзейнасць таварыства будзе актывізавана. Шмат чаго трэба будзе зрабіць у арганізацыйным і прававым плане. Але гэта не значыць, што мы будзем доўга разгойдвацца.

Вадзім Гігін падкрэсліў: наша гістарычная навука зрабіла вялікі крок наперад. «Аднак часта грамадзяне не разумеюць гэтую навуковую мову. Манаграфіі выдаюцца невялікім накладам, не так шмат людзей чытае навуковую літаратуру. Таму нашы мерапрыемствы будуць накіраваны на тое, каб зразумела расказаць пра навуковыя працы, пра тое, чым народ можа ганарыцца, адказаць на вострыя пытанні. Людзі стаміліся ад анлайн-фарматаў. Нельга адмаўляцца ад прамых сустрэч, дыялогаў, дыскусій у калектывах. Але, безумоўна, патрэбныя і дыстанцыйныя формы стасункаў, з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Такая канвергенцыя ў рабоце аб'яднання, безумоўна, будзе».

Падчас з'езда гучалі вельмі завостраныя, шчырыя выступленні прадстаўнікоў рэгіянальных арганізацый таварыства «Веды». Аўтарытэтныя лектары, вучоныя сур'ёзна аналізавалі пралікі таварыства ў зносінах з грамадскасцю, адзначалі неабходнасць сур'ёзнай прапрацоўкі ўдзелу таварыства ў ідэалагічнай рабоце, у спалучэнні інтарэсаў і тых, хто прадстаўляе «Веды», і ідэалагічнай вертыкалі на ўсіх узроўнях. Шмат канкрэтных, вартых увагі ініцыятыў у сцвярджэнні гістарычнай праўды айчыннай гісторыі выклаў у сваім выступленні **старшыня камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ігар МАРЗАЛЮК.**

Дар'я ШЛАПАКОВА.

На кантролі ў Прэзідэнта

ТАВАРЫСТВА ЎЛАСНІКАЎ — НЕ ЗАЎСЁДЫ ЛЕПШЫ ВАРЫЯНТ ДЛЯ ЖЫХАРОЎ

Як дзяржава можа ўмешвацца ў справы прыватных уласнікаў, калі яны не могуць знайсці рады?

А рабіць гэта трэба, пераканана Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, якая наведала сёння адзін праблемны адрас. Як упаўнаважаная Прэзідэнта па Мінску яна завітала ў двор на Нёманскай, 80 — менавіта адсюль прыйшоў калектыўны зварот жыльцоў таварыства ўласнікаў, якія ўжо не першы год пакутуюць ад мноства праблем. Але пачнём з самага пачатку.

Будоўля нестандартнага дома ў новым мікрараёне на Каменнай горцы распачалася яшчэ ў 2011 годзе: пяціпад'езны, рознапавярховы (ад 16 да 22), з убудаванымі памяшканнямі і падземным паркінгам здаваўся будучым навасёлам нейкай доўгачаканай і запаветнай марай. Так, гэта ўсё магло пераўтварыцца ў рэальнасць, але, як гэта бывае, грошы скончыліся і мару давялося падкарэкціраваць... У выніку людзі атрымалі свае ключы, засяліліся ў кватэры, аднак частка дома (разлічаная, відавочна, пад гандлёва-офісныя памяшканні) на першым паверсе і падвал з паркінгам так і засталіся ў недабудаваным стане. Дваровая тэрыторыя таксама пакідала жадаць лепшага. Такім чынам, з 2017-га распачаліся шматлікія праблемы і пакуты жыхароў больш чым трохсот сталічных кватэр.

Кожны год, каб падключыць ацяпленне ў кватэрах, жыхарам даводзіцца ісці да адміністрацыі горада і дамагацца вырашэння сваёй праблемы: першы паверх (паколькі не дабудаваны) не ацяпляецца, а праз яго праходзяць цеплавыя сеткі. Да таго ж карыстанне цеплавымі пушкамі, якія там прадугледжаны, — таксама з катэгорыі пераадолення папяровых перашкод. Пытанне, канешне, вырашаецца, аднак людзей гэта не задавальняе. Асабліва пакутуюць уладальнікі кватэр на другім паверсе: па іх словах, тэмпература пола (пад якім неацяпляльныя памяшканні) можа складаць у зімовы перыяд і 12 градусаў.

Хвалюе жыхароў і тое, што ўвесь гэты час недабудаваны паркінг і падвал — гэта месцы збору асацыяльных элементаў, цяжкіх падлеткаў, расаднік вільгаці і цвілі. Карацей, жах — ды і толькі!

Людзі пішуць скаргі, але рады даць не могуць: прыватная ўласнасць — па-першае, зямельныя пытанні, якія, як вядома, з катэгорыі найскладанейшых у юрыдычнай практыцы, — па-другое. Трэба сказаць, што папярэдні забудоўшчык ужо змяніўся. Зараз сфарміравана новая юрыдычная асоба з 14 удзельнікаў, якія просяць паскорыць выдзяленне зямлі ў іх уласнасць (якая цяпер знаходзіцца ва ўласнасці горада), каб паскорыць некаторыя фінансавыя пытанні.

Пабачыць праблему на ўласныя вочы — найлепшы спосаб разабрацца ў сітуацыі. Таму спікер Савета Рэспублікі пераходзіць ад слоў да справы і прапануе спусціцца ў падвал, які вядзе і ў памяшканне недабудаванага паркінга.

Старшыня таварыства ўласнікаў Таццяна СТАШКОВІЧ (у якой на абслугоўванні, дарэчы, знаходзіцца пяць дамоў) тлумачыць: што змаглі, тое зрабілі, напэўна — не ўсё.

Трэба сказаць, людзі скардзяцца: далёка не ўсё, што, магчыма, робіцца і з боку таварыства — яны лічаць, што парушэнняў хапае і тут. Але гэта зусім іншая гісторыя...

Непакояць жыхароў і менш глабальныя, але ад гэтага не менш значныя для іх пытанні: напрыклад, месца знаходжання кантэйнернай пляцоўкі, якая дастаткова блізка ад жылога дома. Да нядаўняга часу не было ў двары гульнявога абсталявання для дзяцей, як і самога двара ў класічным выглядзе — ён больш нагадваў пакінутую будаўнікамі пляцоўку.

Фота БелТА.

Добраўпарадкаваннем заняўся горад пасля вырашэння шматлікіх папяровых пытанняў. І нарэшце 26 жніўня праінфармаваў Савет Рэспублікі, маўляў, усё зроблена: лаўкі, горкі, трэнажоры, пешаходныя сцежкі. Высадкай дрэў і кустоўя зоймуцца восенню самі жыльцы. Днямі тут пабывала старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец, якая на ўласныя вочы пераканалася ў выкананні работы.

За ўвагу і дапамогу з боку горада і верхняй палаты парламента сёння людзі падзякавалі Наталлі Качанавай. Але трэба ісці далей, пераканана яна, вырашаць унутрыдамавую праблему з убудаванымі памяшканнямі. Спікер Савета Рэспублікі звярнула ўвагу **кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна Сяргея ШКРУДНЕВА,** што гэтае месца, як яго не ізалюй ад наваколля, з'яўляецца дастаткова небяспечным. Як кажуць у народзе, да бяды многа не трэба, таму намаганні мясцовай вертыкалі ўлады яна акцэнтуе на вырашэнні пытанняў з новымі па дабудоўванні гэтых памяшканняў.

Як расказаў адзін з прадстаўнікоў новай юрыдычнай асобы, вырашэнне пытання з зямлёй падштурхне працэс. На першым этапе прапануецца дабудаваць першы цокальны паверх. На гэта, па словах уласніка, грошы ёсць. На другі этап ёсць два інвестары, аднак зямельныя пытанні марудзяць увесь працэс.

Дарэчы, аб грашах. Паводле разлікаў забудоўшчыка, каб завяршыць увесь даўгабуд, неабходны сродкі ў памеры больш за тры мільёны долараў.

— Вам патрэбна толькі выдзяленне зямлі? — пацікавілася Наталля Качанава ў прадстаўніка ўласнікаў і, атрымаўшы станоўчы адказ, запэўніла, што яго вырашэннем зоймуцца гарадскія ўлады. — За вамі — фінансаванне і выкананне праектна-каштарыснай дакументацыі.

Наталля Качанава пераканана: усе пытанні, якія ўзнімаюць людзі, абгрунтаваныя і патрабуюць максімальнага вырашэння.

У размове з журналістамі па выніках убачанага Наталля Качанава падкрэсліла: тое, што зроблена па добраўпарадкаванні дваровай тэрыторыі, добра.

— Далучылася адміністрацыя раёна, і парадак у двары навялі. Важна, каб у гэтым працэсе прымалі ўдзел і жыхары, бо дом людзі пабудавалі за ўласныя сродкі, тут функцыянуе таварыства ўласнікаў, а абслугоўвае прыватная кампанія.

На яе пункт гледжання, неабходна падтрымліваць створаную прыгажосць, але без дзяржаўных структур, падкрэсліла спікер, гэтыя пытанні, на жаль, вырашаліся вельмі доўга.

— Тры гады людзі не маглі разабрацца ў гэтых пытаннях, а дастаткова хутка зрабілі толькі тады, калі звярнуліся ў дзяржаўныя органы ўлады, — адзначыла Наталля Качанава.

Што датычыцца недабудаваных аб'ектаў, яна пераканана: пытанні трэба вырашаць хутка, аператыўна і трымаць на кантролі мясцовым органам улады.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на праблемы функцыянавання таварыства ўласнікаў:

— Сёння мы вывучаем нарматыўна-прававы акт па функцыянаванні таварыстваў уласнікаў у нашай краіне: іх стала дастаткова шмат (людзі маюць права выбіраць, хто будзе абслугоўваць іх жылы дом: ці прыватная кампанія, ці ўласнымі сіламі, ці дзяржаўная ўстанова жыллёва-камунальнай гаспадаркі), і, ведаеце, у гэтых пытаннях у жыхароў стала вельмі шмат скаргаў і прэтэнзій да работы таварыстваў, — акцэнтавала яна ўвагу. — Таму мы разглядаем пытанне аб тым, на якім этапе могуць і павінны падключыцца мясцовыя органы ўлады, каб своечасова вырашаць пытанні няякаснага функцыянавання і работы таварыстваў уласнікаў, якімі не задаволены жыхары. Таму тут я чарговы раз пераканалася, што наспела неабходнасць прыняцця такога заканадаўчага ці прававога акта.

Вольга АНУФРЫЕВА.

ПІСЬМЕННІК — АСОБА, ЯКАЯ АБ'ЯДНОЎВАЕ КРАІНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Падчас круглага стала літаратары паспрабавалі вылучыць асноўныя праблемы сучаснага літаратурнага працэсу, асэнсавалі ролю пісьменніка ў XXI стагоддзі і выказалі асцярогі наконт асаблівасцяў развіцця культурнага поля. Асноўная тэма сустрэчы гучала так: пісьменнік — гэта асоба, якая аб'ядноўвае краіны. Як адзначылі самі ўдзельнікі круглага стала, абставіны і ўмовы негатыўныя, сумныя. Існуе шмат праблем і пытанняў, вырашэнне якіх пакуль не знойдзена. Аб асноўных тэзісах сустрэчы расказвае «Звязда».

Адзіная гуманітарная прастора

Да асэнсавання гэтага паняцця звярталіся амаль усе спікеры круглага стала. Зразумела, што ў кожнага ёсць асабістае бачанне сітуацыі. Але калі разглядаць карціну ў цэлым, пад адзінай прасторай літаратары мелі на ўвазе агульнае творчае поле. Эксперты адзначылі, што неабходна захоўваць найлепшыя традыцыі, у першую чаргу — мову. Яднанне, распрацоўка міжнародных творчых праектаў, удзел у такіх фестывалях, як, напрыклад, Дзень беларускага пісьменства — гэта тыя рэчы, якія дазволяць літаратуры пашырыць свае межы.

Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПЯРЦОЎ адзначыў:

— Праблемы, якія ўзнікаюць вакол літаратуры, і агульныя пытанні гуманітарнай прасторы маюць патрэбу ў абмеркаванні экспертнай, кампетэнтнай супольнасцю. Тут прысутнічаюць не толькі пісьменнікі, але і публіцысты, крытыкі, журналісты — дзеля таго, каб сённяшняя сустрэча была максімальна эфектыўнай.

Ці патрэбна мяжа паміж літаратурай і палітычным працэсам?

Удзельнікі сустрэчы некалькі разоў закраналі тэму міжнародных зносін. Спікеры круглага стала адзначылі, што іх турбуе адразу некалькі аспектаў. Першы — раз'яднанасць з сучаснай культурай Заходняй Еўропы. Літаратары выказалі наступнае меркаванне: трэба звяртаць больш увагі на былыя краіны СССР. Блізкасць моў і супадзенне некаторых культурных кодаў трактуецца імі як добрая нагода для супрацоўніцтва. **Доктар культуралогіі, член-карэспандэнт Расійскай акадэміі навук Аляксандр ЗАПЯСОЦКІ** адзначыў:

— З вялікім шкадаваннем павінен сказаць, што супрацоўніцтва Расіі з Захадам будзе згортвацца. Нам вельмі складана знайсці з імі агульную мову. А супрацоўніцтва з Усходам, у прыватнасці, з краінамі Азіі, пры нашым жыцці не зможа выйсці на яскравы, належны ўзровень. Мяркую, што культура і Расіі, і Украіны, і Беларусі не менш самакаштоўная. Таму трэба далей развіваць агульную ўзаемадзейнасць.

Пісьменнік і выдавецтва

Яшчэ адзін актуальны для літаратурнага працэсу аспект — выдавецкая дзейнасць. У пісьменніка як у прадстаўніка творчай прафесіі ёсць асноўная задача — стварацьякасныя творы. Але на практыцы атрымліваецца, што, акрамя напісання, літаратар павінен вырашаць і іншыя пытанні: як прасунуць твор у масы, як яго прарэкламаваць і, галоўнае, дзе надрукаваць? У краінах ЗША і Заходняй Еўропы гэтым займаюцца літаратурныя агенты, але на постсавецкай прасторы гэты інстытут яшчэ не сфарміраваўся. Таму і атрымліваецца, што пісьменнік павінен выконваць адразу некалькі роляў. **Блогер і публіцыст Міхаіл ХАЗІН** выказаў цікавае меркаванне: у хуткім часе за фінансаванне кніг будуць адказваць дзяржавы. Менавіта яны возьмуць на сябе функцыю выдавецтваў і такім чынам значна спросцяць жыццё пісьменнікам.

Літаратура і моладзь

Шмат слоў гучала ў адрас моладзі, у прыватнасці яе абыякавасці да чытання. Спікеры вінавацяць у гэтым распаўсюджванне інтэрнэту, масавай культуры і нізкапробнай літаратуры. З апошнім тэзісам складана не пагадзіцца: сапраўды, дрэнная літаратура адбівае ўсялякую ахвоту да чытання. Але ніводны з удзельнікаў не прапанаваў метад, які б дазволіў зацікавіць маладога чытача. У гэтым выпадку відавочным робіцца канфлікт паколенняў: дарослыя маюць уласны погляд на сусвет і транслююць яго праз свае кнігі. І крыўдзяцца, што моладзі гэта нецікава. Калі ўжо і разважаць аб падзенні папулярнасці літаратуры, нельга забывацца аб тым, што кнігі чытаюць і сёння, але ў большай ступені праз электронныя носьбіты.

Зараз сярод моладзі вялікай папулярнасцю карыстаецца сацыяльная праблематыка. Пра гэта ведае і **дырэктар украінскага выдавецтва «САММІТ-КНІГА» Іван СЦЯПУРЫН:**

— Я хацеў бы засяродзіць увагу на дзвюх кнігах, якія ўзнімаюць канкрэтныя гуманітарныя пытанні. Яны блізкія як нашым чытачам, так і ўвогуле ўсяму насельніцтву планеты, якое цяпер перажывае складаны перыяд. Першая кніга мае назву «Добра быць жанчынай» і распавядае аб ахвярах гвалту. Гісторыі, якія туды ўвайшлі, носяць дакументальны характар. Тэма наступнай кнігі прысвечана дзецям, якія жывуць у гарачых кропках. Напрыклад, у краінах, дзе моцна развіты наркабізнес. Кніга «Дзеці Вавілона» мае ўніверсальны міжнародны кантэкст.

Пераломны перыяд

Удзельнікі круглага стала адзначылі, што час цяпер няпросты. Але калі адкінуць праблемы пандэміі і засяродзіць увагу толькі на культурным полі, усё роўна застаецца шмат нявырашаных пытанняў. У якім напрамку будзе рухацца літаратурны працэс? Якія формы ён прыме? Ці гэта яго заняпад? Спікеры не даюць адназначнага адказу. Алё ёсць рэч, якая дапамагае знайсці выхад — адукацыя. Функцыя інстытутаў складаецца не толькі з вырошчвання будучых прафесіяналаў. Вышэйшыя ўстановы адукацыі фарміруюць вакол сябе асяродак, дзе інтэлектуалы могуць узаемадзейнічаць і рухаць культурны працэс разам. Рэктар БДУ Андрэй Кароль адзначыў, што ўніверсітэт — гэта неад'емная частка беларускага грамадства, стрыжань, праз які людзі могуць пачуць сябе.

Арына КАРПОВІЧ.
Фота Канстанціна ДРОБАВА.

Міраслаў МЛАДЭНАВІЧ, прафесар Бялградскага ўніверсітэта, Сербія.

— На глабальным узроўні трывога і занепакоенасць усё больш узмацняюцца. З-за распаўсюджвання тэхналогій і безразважнага парушэння бяспекі чалавечага грамадства ўсё часцей прысутнічае скептычны настрой нават сярод творчай інтэлігенцыі.

Матэўш ЦІСКОРСКІ, публіцыст і палітолаг, Польшча.

— На нашых вачах адзіная гуманітарная прастора завяршае сваё існаванне. У асноўным намаганнямі палітычных эліт некаторых краін. На жаль, з-за геапалітычных пытанняў пакутуюць і пісьменнікі, творы якіх перастаюць друкаваць.

Анастасія МАРСІЗ, пісьменніца, Украіна.

— У нашай краіне пісьменнікам, на жаль, можа стаць кожны. Абсалютна не рэгламентуецца чысціня мовы: у творах сучаснай літаратуры можна заўважыць слэнг і нават нецэнзурную лексіку. Гэтыя творы складана назваць літаратурай... Назіраецца заняпад каштоўнасцяў.

На свае вочы

Думкі духоўныя — жыццё і мір

«Ніякай працы і скарбаў ніякіх не шкадуйце для паспалітай карысці для айчыны сваёй» .
Францыск Скарына

Калі вы цікавіцеся гісторыяй, літаратурай і любіце глядзець на ўнікальныя экспанаты, завітайце на выстаўку «Таямніцы беларускага пісьменства», якая праходзіць у Нацыянальным гістарычным музеі. Там прадстаўлена калекцыя даследчыка, лаўрэата прэміі «За духоўнае адраджэнне», аўтара праекта «У пошуках страчанага» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.

Можна ўбачыць прыклады для пісьма ад прыстасаванняў нашых продкаў да «прадстаўнікоў» XX ст., старажытныя пісалы, першыя асадкі і самыя раннія аўтаматычныя ручкі, першыя алоўкі, пер'ечысткі, пясочніцы, нажы для паперы і шмат што іншае. Таксама выстаўка дапамагае даведацца аб тым, якія адмысловыя пісьмовыя прылады змяшчала валізка падарожніка, якая прадукцыя вядомых айчынных і замежных вытворцаў карысталася попытам і была ў продажы ў канцылярскіх і папяровых крамах беларускіх губерній у XIX — пачатку XX стст. Экспазіцыя паказвае школьныя прылады розных эпох, якія яшчэ не страцілі сваіх фарбаў і духу часу. Сярод розных пісьмовых прылад ёсць і тыя, што прысвечаны значным гістарычным падзеям ці звязаны з гістарычнымі асобамі: князямі Радзівіламі, кампазітарам С. Манюшкам, краязнаўцам і гісторыкам О. Гедэманам, фінансістам Л. Паляковым, братамі Тышкевічамі, маршалам С. К. Цімашэнкам і іншымі.

— На выстаўцы мы можам прасачыць за эвалюцыяй як пісьмовых прылад XIX — пачатку XX стагоддзяў, так і культуры пісьменства, якая непасрэдна датычыцца нашай роднай Беларусі. Усе прадметы, якія ёсць у гэтай экспазіцыі, звязаны з нашай краінай, з развіццём нашай дзяржавы, з імкненнем беларусаў атрымаць незалежнасць. Гэта ўнікальная калекцыя, таму што яна адлюстроўвае ўсю эвалюцыю культуры за апошнія 200 гадоў, — тлумачыць **дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Аляксандр ХРАМЫ.**

Унікальнасць згаданага мерапрыемства яшчэ і ў тым, што яно прымеркавана да Дня беларускага пісьменства, якое сёлета праходзіць у Капылі.

— Кніга заўсёды была адным са сродкаў захавання духоўнасці народа. Слова духоўнае ўзвышае жыццё чалавека, для нас вельмі важна захаваць яго і перадаць наступным пакаленням. Няхай гісторыя нашага народа мацнее, захоўвае патрэбнае для сучаснага чалавека і дапамагае сёння сарыентавацца ў выбары правільнага шляху. Хай гэтая выстаўка натхніць людзей творча, — пажадаў прысутным **мітрапаліт ВЕНІЯМІН.**

Можна даведацца цікавыя звесткі, звязаныя з выстаўленымі артэфактамі: каля кожнага экспаната ёсць карысная для гледачоў інфармацыя. А таксама прадстаўлены ўзоры пісьмовых прылад ювелірнага мастацтва, пісьмовыя наборы і чарніліцы ў розных мастацкіх стылях.

— Тут паказаны артэфакты з XX стагоддзя. На жаль, і цяпер у многіх існуе меркаванне, што беларусы былі цёмнымі малаадукаванымі людзьмі. Але я хачу абвергнуць гэта з дапамогай дадзенай выстаўкі. Бо практычна ўсё, што знаходзіцца тут, звязана з нашай культурай. Гэтую выстаўку хочуць бачыць і ў Маскве, і ў Пецярбургу, яе наведалі нават госці з Амерыкі. Яны былі вельмі здзіўлены, што алоўкі, якія прадавалі ў Амерыцы, выраблены ў Гродне ў 1880-х гадах, і гэта былі лепшыя алоўкі ў свеце, — расказаў Уладзімір Ліхадзедаў.

Ангеліна ВАРАТЫНСКАЯ.
Фота аўтара.

Сяргей ПЕШЫН:

«НАША СЛОВА ЧУЖЫМІ ЛІТАРАМІ НЕ НАПІШАШ!»





Ужо больш за стагоддзе выдавецтва «Беларусь» працягвае распавядаць пра гісторыю, культурныя і духоўныя здабыткі нашага народа, знаходзіць невядомыя факты, здзіўляе, прымушае задумацца пра свае вытокі, а галоўнае — адкрывае чытачу прыгожую, загадкавую, усё яшчэ да канца не зведаную краіну. І падаецца, што гэта тэма невычарпальная. Чаму?

— Мы і сёння робім тое самае, з чаго выдавецтва пачыналася, — заўважае **дырэктар выдавецтва «Беларусь» Сяргей ПЕШЫН.** — У 1921 годзе, калі з'явілася дзяржаўнае выдавецтва «Беларусь», ішлі аб'яднаўчыя працэсы савецкіх рэспублік, узнікаў Савецкі Саюз. Ён быў дзяржавай, якая складалася са шматлікіх нацыянальных рэспублік. Панавала расійская кніга, і не толькі рускамоўная, але менавіта з ухілам на расійскія падзеі, расійскую рэчаіснасць, таму паўстала мэта адлюстроўваць сваё адметнае, нацыянальнае, беларускае. Такім чынам, выдавецтва «Беларусь» з першых гадоў існавання ўжо заняло сваю нішу, паказвала беларускую гісторыю, культуру, мову. Нават у першыя дзесяцігодзі, нягледзячы на тое, што ў рэспубліцы было чатыры дзяржаўныя мовы, наклады кніг на беларускай мове дасягалі 90 працэнтаў. Выдадзены мільёны экзэмпляраў. У ваенныя часы выдавецтва было вывезена ў тыл, у Маскву, працягвала працаваць там пераважна для фронту: выдаваліся кнігі, агітацыйная прадукцыя, што праз лінію фронту перапраўлялася на акупаваныя тэрыторыі. І там дамінавалі выданні на беларускай мове, яны ўздымалі самасвядомасць беларусаў, падштурхоўвалі да развіцця партызанскага руху, нагадвалі, за што яны змагаюцца. У паслявоенныя часы мы ўжо не былі манапалістамі, як адзінае дзяржаўнае выдавецтва. Некаторыя рэдакцыі адасаблівaліся, і з іх рабіліся самастойныя ўстановы, напрыклад, «Мастацкая літаратура», «Народная асвета». І ў наш час абвастрылася тая мэта, якая стаяла напачатку: незалежнасць, суверэнная дзяржава, Адсюль наш слоган «Беларусь» пра Беларусь». Апошнім часам мы спецыялізуемся на культуралагічнай, гістарычнай тэматыцы і, безумоўна, звяртаем увагу на тыя падзеі, што адбываюцца ў нашай краіне, на тое, як мяняецца свет і наш чытач.

— Ці даводзіцца выдавецтву канкураваць з інтэрнэтам?

— Нам крыху прасцей у плане канкурэнцыі з электронікай, чым выдавецтвам, якія выдаюць мастацкую літаратуру. Прачытаць са смартфона мастацкі твор больш зручна, а нашы навукова-папулярныя выданні багата ілюстраваныя, могуць змяшчаць схемы, графікі. У невялікім фармаце экрана яны фактычна нечытэльныя, я ўжо не кажу пра эстэтычную якасць такіх выданняў. Напрыклад, мы робім турыстычнае выданне «Белорусский гостинец», якое паказвае ўсё, што ёсць цікавага ўздоўж нашай галоўнай трасы з Брэста на Маскву, па якой да нас заязджае найбольшая колькасць гасцей. Гэта выдатны падарунак для тых, хто едзе транзітам і не мае шмат часу, каб павандраваць па Беларусі. Кніга прэзентуе краіну. Як яе можна паказаць у электронным варыянце?

Ёсць шмат пытанняў да дакладнасці інфармацыі, што падаецца ў інтэрнэце. Калі мы адкрыем «Вікіпедыю» і паглядзім артыкулы па адной тэме на беларускай, рускай і англійскай мовах, можам атрымаць супрацьлеглую інфармацыю пра нейкія падзеі, на што ўплываюць пэўныя адносіны паміж дзяржавамі, палітычныя аспекты. Інтэрнэт — адкрытая прастора, там сапраўды ёсць інфармацыя, вартая ўвагі, але і шмат смецця, і арыентавацца ў гэтым непадрыхтаванаму чалавеку даволі цяжка. Наша ж літаратура вызначаецца вельмі добрымі аўтарамі, якія працуюць у галоўных музеях краіны, у Белавежскай пушчы. Выдавецтва шчыльна супрацоўнічае з Нацыянальнай акадэміяй навук. Часта да нас прыходзяць аўтары з унікальнымі і цудоўнымі ідэямі. Таксама мы глядзім, якая тэматыка актуальная, і звяртаемся да адмысловых спецыялістаў у сваёй галіне. Да Года малой радзімы мы заснавалі серыю «Падарожжа па родным краі». Пра кожны куточак ствараецца кніга. Гэта дае магчымасць падрабязна расказаць пра знакамітых людзей гэтай мясцовасці, значныя для яе падзеі. Калі збіраем шмат кніжак у гэтай серыі, у выніку атрымліваем ізноў адну нашу вялікую краіну Беларусь, толькі шматтомную, падрабязна распісаную.

— І гэтую серыю мы будзем працягваць, бо да такой тэматыкі вельмі вялікая цікавасць у бібліятэк. Кнігі запатрабаваныя ў сістэме адукацыі і ў галіне турызму, — далучаецца да размовы **вядучы спецыяліст выдавецтва Анжэла САДОЎСКАЯ.** — Форсмажорныя абставіны, звязаныя з пандэміяй, дазволілі многім паіншаму паглядзець на Беларусь. Людзі пачалі з захапленнем адкрываць яе для сябе. А такія кнігі, па сутнасці, — гатовыя турыстычныя маршруты. Наогул, насіць токое імя, як «Беларусь», для выдавецтва — вялікая адказнасць. Нашы кнігі маюць выхаваўчае значэнне, ідэалагічнае, патрыятычнае. Слоган «Беларусь пра Беларусь» мае працяг — «Гісторыя краіны з 1921 года», таму ўсё, што адбываецца ў краіне, знаходзіць адлюстраванне ў нашых выданнях. Сярод нашых аўтараў — вядучыя гісторыкі, супрацоўнікі Нацыянальнага гістарычнага архіва, прафесары, людзі, якія маюць сур'ёзныя веды. І сёння, калі гісторыя «перапісваецца», трактуецца інакш, маладому пакаленню трэба дапамагаць разбірацца, тлумачыць многія рэчы. Так, да Года народнага адзінства ў нас выйшлі зборнікі дакументаў «Польшча — Беларусь 1921—1953» і «Рыжскі мір 1921—1953 у лёсе беларускага народа».

— Падзеі 1939 года, калі былі аб'яднаны Усходняя і Заходняя Беларусь, маюць вялікае значэнне, — гаворыць Сяргей Пешын. Гэтыя кнігі, заснаваныя на гістарычных дакументах, ахопліваюць і перадумовы, і наступствы тых падзей. Вялікая колькасць фотаздымкаў, копій сапраўдных дакументаў, каментарыі вучоных, як усё адбывалася, у такіх кнігах адкідваюць усялякія інсінуацыі, трактоўкі і выводзяць нас на разумны шлях погляду на гістарычныя падзеі. Такія дакументы проста так у інтэрнэце не знойдзеш.

— Правільна падабраная інфармацыя, знаёмства з фактамі беларускай гісторыі і культуры ўжо могуць мець моцны выхаваўчы эфект?

— У нас наогул ёсць не вельмі добрая традыцыя пасыпаць галаву попелам і казаць, што мы, маўляў, — маленькі народ, у якога нічога свайго ніколі не было. Мы шмат гадоў выдаём серыю «Славутыя мастакі з Беларусі». Калі дакрануліся прафесійна да гэтай тэматыкі, паўсплывалі такія імёны, што нам толькі ганарыцца і ганарыцца. Сярод іх — асобы, якія цаніліся па ўсім свеце. Мы выдалі ўжо больш за 30 (а ў планах — больш за 100) кніг. Наогул, з тэматыкай культуры і мастацтва мы працуем плённа. У выданні «Напалеон Орда», якое на гэты год з'яўляецца лідарам продажаў, змаглі змясціць усе гравюры мастака, якія захоўваюцца ў Беларусі ў розных установах і прыватных зборах. Шмат увагі ўдзяляем традыцыйнай культуры. Вельмі цікавая кніга А. С. Сардарава «Храм», прысвечаная храмаваму будаўніцтву за ўвесь час усіх асноўных канфесій, якія існуюць у Беларусі. Спецыяліст супастаўляе нашу храмавую архітэктуру з сусветнай. Добра відаць, што ў нас агульнага з сусветным вопытам, у чым наша адметнасць. Так, нашы сінагогі розняцца, яны беларускія, тое ж і з мячэцямі. Але галоўнае, што паказвае гэта кніга, Беларусь — шматканфесійная краіна, і ў нас фактычна ніколі не было міжканфесійных канфліктаў, як, напрыклад, у Еўропе, і гэта тое, чым трэба даражыць.

На жаль, культура чытання падае. Але я спадзяюся, што ўсплеск моды на гаджэты пройдзе. Пакуль чалавеку, які прагне ведаў, без папяровай кнігі ніяк не абысціся. У любой кніжцы ёсць і другое, і пятае дно. Гэта вельмі аб'ёмісты прадукт.

У нас у гэтым годзе выйшла адмысловае выданне «ЛітАрт», прысвечанае кнізе як аб'екту мастацтва. Разглядаюцца аспекты, з якіх складаецца кніга: ад шрыфту да ілюстрацый. Першы яе раздзел — «Шрыфт як код ідэнтычнасці». Можа падацца, што мы занадта замахнуліся, але на самай справе заўважана такая з'ява. Калі мастакі толькі атрымалі камп'ютар і шрыфтоў было мала, яны вымушаны былі выкарыстоўваць лацінскія шрыфты для напісання кірылічных тэкстаў і наадварот. Здавалася б, літары вельмі падобныя. Аказалася, што замежнікам цяжка чытаць слова, якое набрана кірылічным шрыфтам. Абрысы літаркі розныя ў кірыліцы і лаціны, і гэта перашкаджае ўспрыманню, збівае тэмп — адсюль пачынаецца ўсведамленне свайго нацыянальнага. Наша слова чужымі літарамі не напішаш. Патрыятызм ідзе ад мовы, ад культуры, ад мастацтва, ад гісторыі і ад умення правільна карыстацца звесткамі, каб ніхто не мог цябе завярнуць у іншы бок.

— Чым для вас з'яўляецца Дзень беларускага пісьменства?

— Найперш гэта прафесійнае свята. Мы бачым, што кніга жыве і мы робім патрэбнае. Гэта надае імпэту і жадання працаваць далей. Гэта пэўная вяха ў нашай працы, своеасаблівая справаздача за год, а сёлета — і за сто гадоў. І мы працягваем працаваць у нацыянальнай дзяржаўнай плыні.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Акцыі

Ад сцен Брэсцкай крэпасці

З гэтага памятнага месца ўчора стартаваў рэспубліканскі аўтапрабег «Сімвал адзінства». Яго маршрут звяжа Брэст, Баранавічы і Пінск з усімі 16 раёнамі, перадае карэспандэнт БелТА.

За два дні маршрут аўтапрабегу праляжа па ўсёй тэрыторыі Брэсцкай вобласці ў выглядзе эстафеты. Раёны будуць перадаваць імянныя мяшочкі са збожжам новага ўраджаю — як сімвал адзінства. «Мы стартуем у знакавым, свяшчэнным для кожнага беларуса месцы — Брэсцкай крэпасці-героі. Менавіта тут у далёкім 1941 годзе быў зроблены першы крок да Вялікай Перамогі. Сёння мы жывём у мірнай, спакойнай, незалежнай краіне. Гэта галоўнае дасягненне беларускага народа. Аўтапрабег прызначаны паказаць адзінства нашай краіны і з'яднанасць рэгіёнаў», — адзначыў **старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый НАРКЕВІЧ.** У крэпасці ўдзельнікі аўтапрабегу ўсклалі кветкі да Вечнага агню і ўшанавалі памяць герояў.

Брэст і Брэсцкі раён перададуць эстафету Маларыцкаму раёну. Далей маршрут аўтапрабегу праляжа праз Кобрынскі, Жабінкаўскі, Камянецкі, Пружанскі, Іванцэвіцкі, Бярозаўскі, Драгічынскі, Іванаўскі раёны і зробіць прыпынак у Століне. На наступны дзень удзельнікі адправяцца ў Пінск, праедуць па Лунінецкім, Ганцавіцкім, Ляхавіцкім, Баранавіцкім раёнах і Баранавічах.

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА павітаў удзельнікаў аўтапрабегу на адным з пунктаў Брэсцкага раёна. «Кожны раён унясе свой важкі ўклад у агульную справу. Патрыёты краіны прывязуць самае мірнае, што толькі можа быць, — збожжа», — падкрэсліў губернатар. Эстафета ад Брэсцкай вобласці пяройдзе да Гродзенскай вобласці.

«Наша задача — за кароткі час аб'ехаць усю Беларусь, 118 раённых цэнтраў. Хочам паказаць, якая прыгожая ў нас краіна, якія тут жывуць добрыя людзі. Размаўлялі з маладымі людзьмі, каб яны выбіралі зручныя маршруты з прыгожымі месцамі», — расказалі **кіраўнікі грамадскага аб'яднання «Патрыёты Беларусі» Сяргей РАЧКОЎСКІ і Ганна ХАРУТА.**

Аўтакалона аб'едзе ўсю Беларусь. Кожны рэгіён перадасць удзельнікам мяшочак са збожжам, з якога спякуць каравай. Фінальным пунктам стане Мінск — 17 верасня.

На кантролі

Відавочная карысць ад вакцынавання

На нарадзе з медыкамі, якую правяла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, гаворка датычылася гатоўнасці сістэмы аховы здароўя да сезоннага ўздыму захваральнасці, у тым ліку і COVID-інфекцыяй.

На традыцыйнай нарадзе, якую штотыднёва праводзіць спікер верхняй палаты парламента, абмяркоўвалася ступень гатоўнасці медыцынскіх устаноў да эпідэміялагічнага асенне-зімняга сезона. Наталля Качанава пацікавілася ва ўдзельнікаў нарады станам спраў з COVID-інфекцыяй, асабліва ў Мінску. Што і зразумела: у ВНУ пасля летніх канікул вярнуліся студэнты, школьнікі прыехалі дахаты ад сваіх бабуль і дзядуль, а людзі сталага ўзросту — з лецішчаў у свае гарадскія кватэры. Уплывае на сітуацыю і асенняе мокрае надвор'е. Усе гэтыя фактары, лічыць **міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ,** ускладняюць існуючую сітуацыю, але не з'яўляюцца крытычнымі. Па яго словах, зараз адзначаецца невялікі сезонны рост захваральнасці, які раўнамерны па ўсіх рэгіёнах.

Удзельнікі нарады падрабязна расказалі аб гатоўнасці ўстаноў аховы здароўя аказваць неабходную медыцынскую дапамогу насельніцтву: як у частцы стацыянарнага, так і амбулаторнага лячэння, а таксама прафілактыкі захваральнасці; агучылі аналітычныя даныя аб эфектыўнасці вакцынавання ад COVID-інфекцыі.

Наталля Качанава асабліва звярнула ўвагу на тое, што, згодна з атрыманымі данымі па Мінску, захваральнасць у пацыентаў, якія раней вакцынаваліся двума кампанентамі прышчэпкі ад COVID-інфекцыі, складае ўсяго 0,11 %, што пацвярджае эфектыўнасць такой прафілактыкі.

І напрыканцы ўдзельнікі нарады абмеркавалі дзейнасць ПЦР-лабараторый.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Парламенцкі дзённік

Яшчэ адзін крок да новай Канстытуцыі

У Палаце прадстаўнікоў прайшло пасяджэнне камісіі па падрыхтоўцы праекта закона «Аб змяненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь».

На сустрэчы разглядаўся ход падрыхтоўкі законапраекта да другога чытання. У першым чытанні ён быў прыняты 25 чэрвеня. «За перыяд, які прайшоў з гэтага часу, мы правялі абмеркаванне гэтага законапраекта ў пастаянных камісіях, з усімі зацікаўленымі міністэрствамі і ведамствамі. Таксама законапраект быў накіраваны на разгляд кіраўніку дзяржавы. Мы атрымалі адабрэнне ўсіх зацікаўленых суб'ектаў дзяржаўнага працэсу», — перадае БелТА словы **Валянціна СЕМЯНЯКІ, старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў.**

Адной з новых нормаў з'яўляецца ўвядзенне адзінага дня галасавання на выбарах дэпутатаў. «Законапраект мае на ўвазе ўвядзенне гэтай нормы ў Асноўны Закон нашай краіны. Акрамя таго, прадугледжваецца ўвядзенне пераходнай меры пра падаўжэнне паўнамоцтваў мясцовых Саветаў дэпутатаў для таго, каб сінхранізаваць тэрміны кадэнцыі і ўжо ў найбліжэйшы час прыступіць да правапрымяняльнай практыкі дадзенага закона», — адзначыў дэпутат.

Па яго словах, гэта міжнародная практыка, якая мае шэраг пераваг: ад эканамічных да грамадска-палітычных.

«Абмеркаванне з выбаршчыкамі праекта закона паказала, што абсалютная большасць падтрымлівае прапанаваныя змены. Акрамя таго, калі аналізаваць прапановы, якія паступалі ў ходзе падрыхтоўкі змяненняў у Канстытуцыю, то гэтая норма была адной з самых папулярных», — адзначыў парламентарый.

СТРАСЦІ ПА МОСЦЕ

ЗНОЎ — ПРАЗ ДВАЦЦАЦЬ ГАДОЎ

Жыхарка Наваполацка паведаміла рэдакцыі «Звязды» аб праблемах для гараджан у сувязі з пачаткам капітальнага рамонту адзінага моста праз Заходнюю Дзвіну, які мае назву Калінінскі. Рух аўтамабільнага транспарту праз мост спынілі 18 чэрвеня, яшчэ праз тыдзень увялі табу для пешаходаў.

У сваім лісце чытачка падкрэсліла, што аслабленым людзям цяжка падымацца па горцы ад пантона, які ўсталявалі недалёка ад месца будаўнічых работ. Яшчэ жанчына задала пытанне: чаму гэты самы мост поўнасцю не прывялі ў парадак каля дваццаці гадоў таму, калі таксама капітальна рамантавалі? Дык што — перыядычна будуць закрываць, каб праз параўнальна нядоўгі час даць магчымасць зарабіць праекціроўшчыкам і будаўнікам? Логіка пытанняў зразумелая.

Тры гады таму дарожнікі спрабавалі прадоўжыць жыццё моста, але... было відавочна, што так званы падтрымлівальны рамонт — не выхад. Гараджан папярэдзілі, што мост будуць рамантаваць капітальна.

ПРА ШТО МАЎЧАЦЬ АМАТАРЫ ХАЙПУ

Дарэчы, у сацыяльных сетках ужо нямала каментарыяў па тэме. Маўляў, раўнадушныя чыноўнікі не падумалі, як будуць жыць гараджане, якія вымушаны, каб патрапіць на іншы бераг, ехаць праз суседні Полацк. Некаторыя блогеры і СМІ на гэтым спрабуюць павысіць рэйтынг. Падобныя сітуацыі — спакуса для хайпу. Вось толькі ніхто не падказвае: што рабіць, якая альтэрнатыва сітуацыі, што склалася? Трэба было дачакацца, калі б мост разбурыўся і людзі траўміраваліся або загінулі?

Забываюць паведаміць і пра тое, што зроблена, каб

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



трохі згладзіць праблему. Напрыклад, у садкі, школы, ва ўстановы сацыяльнай абароны, аховы здароўя можна часова хадзіць у тыя, што на гэтым беразе. Кіраўніцтва гарвыканкама арганізавала новыя маршруты грамадскага транспарту, супрацоўнікі МНС зманціравалі пантонную пешаходную пераправу, па якой могуць праехаць і аўто экстранных службаў.

Пра тое, што ўлады да думак людзей прыслухоўваюцца, сведчыць рубрыка на сайце гарадской газеты «Новополоцк сегодня», прысвечаная тэме рамонту моста. Трэба сказаць, што людзі з разуменнем ставяцца да сітуацыі. Усё з часам трэба рамантаваць або замяняць.

Тутэйшыя распрацавалі маршруты, каб дабірацца з берага на бераг. Пантоннай пераправай карыстаюцца жыхары Наваполацка, Міжрэчча, Баравухі, суседніх раёнаў і палачане. У Наваполацкім гарвыканкаме расказалі пра арганізацыю перахапляльных парковак для аўтамабіляў. Уносяць змяненні ў расклад руху аўтобусаў і маршрутак. Для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, у тым ліку дзяцей з асаблівасцямі развіцця, старых, запусцілі бясплатнае сацыяльнае таксі.

ЯК НА ТРЭЦІ ПАВЕРХ

Пантонную пераправу перад маразамі закрыюць. Тады прыйдзецца ехаць на іншы бок праз Полацк, а гэта каля трыццаці пяці кіламетраў...

Перад камандзіроўкай задумаўся пра абутак. Дарога да пантона і з яго ўяўлялася бруднай. Супрацоўнік гарвыканкама супакоіў: не ўсё так дрэнна. Дарэчы, мост і пантон — хвілін пятнаццаць ад будынка на цэнтральнай плошчы горада, дзе працуе адміністрацыя горада.

Спачатку ўбачыў мост на рэканструкцыі. Потым апынуўся ў маляўнічым парку, пад нагамі — асфальтаваная дарожка. Сам пантон, асабліва для тых, хто бачыць яго ўпершыню, натхняе на фатаграфаванне. З аднаго яго боку ўсталяваныя лаўкі для адпачынку. Каля пантона кругласутачна дзяжурацъ супрацоўнікі МНС.

Паднімацца з пантона сапраўды цяжкавата — можна параўнаць з нагрузкай пры пад'ёме на трэці паверх жылога дома. Усё з-за асабліваści рэльефу. Каб зрэзаць круты пад'ём, патрэбныя вялікія рэсурсы. У іншым месцы размясціць пантон немэтазгодна.

Выхад — адрамантаваць хутка. Журналіста «Звязды» запрасілі на пасяджэнне штаба будаўнікоў. **Генеральны дырэктар РУП «Віцебскаўтадора» Адам КАНОПЛІЧ** як прадстаўнік заказчыка выслухваў справаздачы тых, хто працуе на аб'екце, рабіў заўвагі. Задача — як мага хутчэй, пры гэтым вельмі якасна зрабіць усё неабходнае, каб мост зноў пачаў функцыянаваць.

Фінансаванне капрамонту вядзецца ў рамках дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы рэспубліканскага дарожнага фонду. Нарматыўны тэрмін — 26 месяцаў. Пастараюцца здаць аб'ект пад ключ ужо ў наступным годзе. Пра канкрэтную дату пакуль гаварыць рана.

Адам Канопліч патлумачыў, чаму праз 20 гадоў зноў паўстала неабходнасць у капітальным рамонце. Павялічыліся вага аўтатранспарту, інтэнсіўнасць руху, адпаведна — нагрузкі на канструкцыю.

Дарэчы, наваполацкі мост, узведзены ў 1962 годзе, даволі рэдкай канструкцыі: верхняя жалезабетонная частка замацаваная на каробках з бетону, пустых унутры. Канструкцыйная асаблівасць уплывае на методыку рамонту.

Пасля рэканструкцыі шырыня праезнай часткі будзе 11 метраў, што больш на два метры, чым цяпер. Пешаходы будуць хадзіць па тратуарах шырынёй у тры метры кожны.

БУДЗЕ ДВА

У суседнім Полацку восенню 2019 года мост па вуліцы Юбілейная быў таксама закрыты прыкладна на год з-за капітальнага рамонту. Тады выкарыстоўваўся адзіны мост на вуліцы Багдановіча. Аўтамабільныя заторы сталі звыклымі, як і нязручнасці для пасажыраў грамадскага транспарту. Цяпер абноўлены полацкі мост радуе вочы, а праблемы забываюцца.

Ёсць населеныя пункты, дзе «маставыя пытанні» з барадой. «Звязда» не раз пісала пра гарадскі пасёлак Сураж, які прыкладна за сорак кіламетраў ад Віцебска і недалёка ад Расіі. Калі вялікая вада, і не курсіруюць паромная пераправа і катар, палова населенага пункта апынаецца па-за цывілізацыяй. Даехаць з аднаго берага на іншы бывае працей праз Расію. Насельніцтва Суража — менш за 900 чалавек, з Наваполацкам не параўнаць, але кожны чалавек мае права жыць зручна. Мясцовая ўлада штогод прадумвае лагістыку. Перспектыва будаўніцтва пастаяннай пераправы пакуль што далёкая.

Новапалачанам чакаць усяго каля года... Для іх плануюць узвесці яшчэ адзін мост. Размовы вядуцца даўно, але прынцыповае рашэнне ўжо прынятае.

Аляксандр ПУКШАНСКІ,
г. Наваполацк.
Фота аўтара.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Энергетычны экспарт Расіі можа знізіцца на $179 мільярдаў

Ашчадбанк прагназуе, што энергетычны экспарт Расіі можа ўпасці на 179 мільярдаў долараў да 2035 года з-за энергапераходу, заявіў кіраўнік банка Герман Грэф, выступаючы на адной з сесій ВЭФ.

Паводле даследавання банка, якое прадставіў банкір, да 2050 года падзенне складзе 192 мільярды долараў.

«Гэта, вядома ж, прамое выкарыстанне гэтага паліва ў выглядзе крыніц энергіі. Калі мы здолеем зрабіць (а гэта трэба зрабіць, вядома ж) два манеўры — у першую чаргу, іншыя спосабы перапрацоўкі — гэта газахімія і нафтахімія, і ператварэнне гэтых тэхналогій у больш экалагічныя сістэмы, — то тады лічбы мы зможам пабачыць іншыя», — заявіў Грэф.

Патэнцыяльнае падзенне вытворчасці да 2050 года нафты і газавага кандэнсату (пры энергаперахадзе) эксперты найбуйнейшага расійскага банка ацанілі ў 72 %, газу — 52 %, энергетычнага вугалю — 90 %.

У Нідэрландах хочуць забараніць фастфуд для барацьбы з атлусценнем

Улады як мінімум пяці гарадоў у Нідэрландах маюць намер забараніць пастаўкі фастфуду і іншых шкодных прадуктаў ва ўстановы грамадскага харчавання, паведамляе газета NL Times.

Улады Амстэрдама, Гаагі, Ратэрдама, Утрэхта і Эдэ накіравалі ліст дзяржаўнаму сакратару па пытаннях аховы здароўя, дабрабыту і спорту Полу Блокхейсу з просьбай даць ім дадатковыя паўнамоцтвы ў сферы рэгулявання колькасці рэстаранаў са шкоднай ежай.

Як падкрэслівае выданне, на гэты момант у мясцовых улад практычна няма магчымасцяў паўплываць на харчовыя звычкі насельніцтва і скараціць колькасць шкодных прадуктаў на рынку. «Паколькі мы разглядаем харчаванне як індывідуальны выбар, муніцыпалітэты і ўрад не маюць магчымасці ўмешвацца ў гэтае пытанне ў адпаведнасці з заканадаўствам», — патлумачыла дацэнт Амстэрдамскага ўніверсітэта Аніка дэ Руйтэр. Адзначаецца, што праблема атлусцення ў Нідэрландах сёння становіцца ўсё больш распаўсюджанай.

Расійскія золатаздабытчыкі разбагацелі дзякуючы каранавірусу

Расійскія золатаздабытчыкі зарабілі і разбагацелі дзякуючы пандэміі каранавіруса, падчас якой сусветныя цэны на каштоўны метал трымаліся на стабільна высокім узроўні, пішуць «Ведомости» са спасылкай на даследаванне аўдытарскай кампаніі PricewaterhouseCoopers (PwC).

Рост цэн на сусветным рынку быў звязаны з імкненнем інвестараў застрахавацца ад глабальных рызык і ўкласціся ў надзейны актыў, якім традыцыйна лічыцца золата. Па выніках 2020 года сярэднесусветная цана адной унцыі вырасла да 1770 долараў, на 27 працэнтаў перавысіўшы паказчыкі 2019-га. Пры гэтым у асобныя моманты на працягу года цана перавышала і 2000 долараў.

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Большая игра»

1. Сведения об организаторе:
Организатором рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Организатор) с местом нахождения по адресу: 220030, Беларусь, г. Минск, пл. Свободы, д. 4, офисное помещение № 334. Электронный адрес: post@forte.by.

2. Наименование рекламной игры: «Большая игра».

3. Срок начала и окончания рекламной игры: 05 апреля 2021 г. – 13 сентября 2021 г.

4. Сведения о государственной регистрации рекламной игры:
Рекламная игра зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 31 марта 2021 года, свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3966.

5. Сведения о количестве участников рекламной игры:
В рекламной игре приняло участие 8879 человек.

6. Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:
Призовой фонд разыгран полностью.

7. Фамилия, инициалы победителя (победителей), его выигрыш (их выигрыши):

№ розыгрыша РИ	Ф.И.О. Победителей РИ	Приз
I	1. Карицкий С. Л.	**Ноутбук Lenovo ThinkBook 14-IIL (20SL00FERU)** стоимостью 1899,00 рублей, а также денежные средства в сумме 261,34 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
	2. Герасименко А. В.	**Ноутбук Lenovo ThinkBook 14-IIL (20SL00FERU)** стоимостью 1899,00 рублей, а также денежные средства в сумме 261,34 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
II	3. Пусенков А. Г.	**Утюг с парогенератором Braun IS7155WH** стоимостью 949,00 рублей, а также денежные средства в сумме 119,39 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
	4. Мамченко А. Л.	**Утюг с парогенератором Braun IS7155WH** стоимостью 949,00 рублей, а также денежные средства в сумме 119,39 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
III	5. Гаврилюк А. Н.	**Электросамокат Xiaomi Electric Scooter Essential / FBC4022GL** стоимостью 999,00 рублей, а также денежные средства в сумме 126,86 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
	6. Крыштапович Д. И.	**Электросамокат Xiaomi Electric Scooter Essential / FBC4022GL** стоимостью 999,00 рублей, а также денежные средства в сумме 126,86 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
IV	7. Королева В. О.	**Вертикальный пылесос Bosch BCH6L2561** стоимостью 639,00 рублей, а также денежные средства в сумме 73,07 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
	8. Кучминская С. Н.	**Вертикальный пылесос Bosch BCH6L2561** стоимостью 639,00 рублей, а также денежные средства в сумме 73,07 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
V	9. Корниенко А. С.	**Электрогриль DeLonghi CGH1030D** стоимостью 979,00 рублей, а также денежные средства в сумме 123,87 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
	10. Романчук Д. И.	**Электрогриль DeLonghi CGH1030D** стоимостью 979,00 рублей, а также денежные средства в сумме 123,87 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
VI	11. Тептюк С. Н.	**Мультиварка Bosch MUC88B68RU** стоимостью 1099,00 рублей, а также денежные средства в сумме 141,80 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
	12. Яцевич А. С.	**Мультиварка Bosch MUC88B68RU** стоимостью 1099,00 рублей, а также денежные средства в сумме 141,80 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
VII	13. Белоцкий В. В.	**Профессиональный фен Dyson Supersonic 338938-01 (с набором фирменных чехлов)** стоимостью 1340,00 рублей, а также денежные средства в сумме 177,82 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
	14. Матвеев А. В.	**Профессиональный фен Dyson Supersonic 338938-01 (с набором фирменных чехлов)** стоимостью 1340,00 рублей, а также денежные средства в сумме 177,82 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
VIII	15. Ефименко Д. Ф.	**Игровая приставка Sony PlayStation 4 1TB+GTS/HZD CE/SpiderM/PS719391302 (PS+3M)** стоимостью 1029,99 рублей, а также денежные средства в сумме 131,49 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
	16. Бычковская М. А.	**Игровая приставка Sony PlayStation 4 1TB+GTS/HZD CE/SpiderM/PS719391302 (PS+3M)** стоимостью 1029,99 рублей, а также денежные средства в сумме 131,49 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза
Главный Приз	Масло А. Б.	**Автомобиль Volkswagen Polo** Объем двигателя: 1598 см³. Цвет: красный металлик. Куз. №: XW8ZZZCKZMG015689 Год выпуска: 2020 Страна происхождения: РФ; стоимость 32 024,00 рублей, а также денежные средства в сумме 4762,78 рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости Приза

8. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: + 375 29 670 30 26.

Адукацыя

ХРАМ НАВУКІ

Школа імя С. І. Грыцаўца, якая адкрылася 1 верасня, ажыццявіла самы вялікі набор вучняў на Брэстчыне

Доўгачаканы падарунак ад будаўнікоў напярэдадні Дня ведаў атрымалі юныя жыхары баранавіцкага мікрараёна Бараўкі — самага густанаселенага ў горадзе. 1 верасня ва ўрачыстай атмасферы тут адкрылі новую школу. Сярэдняя школа № 1 атрымала імя вядомага савецкага лётчыка, двойчы Героя Савецкага Саюза Сяргея Грыцаўца. Сёння гэта самая вялікая школа ў Баранавічах. Тут будуць вучыцца 1700 дзяцей, і амаль кожны шосты з іх — першакласнік.

— Будаўнікі, прыкладаючы максімум намаганняў, увялі школу вельмі хутка: зроблена якасна, прыгожа і зручна. Прадугледжана ўсё неабходнае для атрымання добрых ведаў. У нашай краіне вялікая ўвага ўдзяляецца адукацыі. Усё гэта робіцца для дзяцей, каб яны вучыліся і выраслі сапраўднымі людзьмі, годнымі грамадзянамі сваёй краіны, — адзначыў **кіраўнік спраў Прэзідэнта — упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы па Брэсцкай вобласці Валерый ІВАНОЎ.** У падарунак ён уручыў школе сертыфікат на набыццё мультыборда.

Участак школы займае 3,2 га. Для догляду такой вялікай тэрыторыі **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА** падарыў навасельцам газонакасілку.

— У краіне сёння свята: дзеці ідуць у школу. У Брэсцкай вобласці больш за 170 тысяч навучэнцаў сядуць за парты, з іх каля 17 тысяч — першакласнікі. Для Баранавічаў, вядома, гэты дзень асаблівы, — сказаў губернатар. — Неўзабаве мы будзем адзначаць Дзень народнага адзінства. У гэтым паняцці закладзены вялікі сэнс. Мы, беларусы, ганарымся сваёй краінай. Малодшае пакаленне, думаю, прыкладваючы далоньку да свайго сэрца, будзе адчуваць тое ж самае, — сказаў Юрый Шулейка.

Па словах **дырэктара школы Марыны КУПЦОВАЙ,** на тэрыторыі мікрараёна Бараўкі сёння пражывае прыкладна 6000 дзяцей школьнага ўзросту. Да гэтага тут былі пабудаваны два дзіцячыя садкі, а вось школьных месцаў, шчыра кажучы, не хапала. І праблема будаўніцтва новай сучаснай школы была вельмі вострай. Да найбліжэйшых школ дзецям прыходзілася дабірацца на аўтобусе.

— Пагадзіцеся, што кожны з бацькоў жадае, каб школа была недалёка ад дома і дзеці маглі хадзіць туды пешшу, — падкрэсліла Марына Георгіеўна. — І вось у лютым мінулага года будаўнікі пачалі ўзводзіць у Бараўках новую ўстанову адукацыі. Генпадрадчыкам па гэтым аб'екце было баранавіцкае Будупраўленне-213, прымалі ўдзел і шматлікія субпадрадчыкі. Усе работы выконваліся ў адпаведнасці з графікам. Няма ў нас нараканняў і па якасці будаўнічых работ. Аб'ект атрымаўся проста цудоўны. За гэта мы вельмі ўдзячны будаўнікам!

Што датычыцца педагагічнага калектыву, то да яго фарміравання мы прыступілі ў пачатку 2021 года. Калі аб гэтым апавясцілі педагагічную грамадскасць горада, то адразу нам паступілі заявы ад настаўнікаў, якія пражываюць у гэтым мікрараёне. Астатніх запрашалі з іншых навучальных устаноў горада. На такія спецыяльнасці, як настаўнік малодшых класаў, альбо англійскай і рускай моў, нават прыйшлося праводзіць конкурс, бо ахвотных працаваць менавіта ў нашай школе было дастаткова шмат.

Фота БелТА.

Школа імя Грыцаўца ажыццявіла самы вялікі набор навучэнцаў ва ўсёй Брэсцкай вобласці. Напрыклад, тут налічваецца 10 першых класаў, 8 другіх і г. д. Увогуле, у першай школе могуць навучацца 1020 дзяцей у змену.

Як расказала дырэктар, многія жыхары мікрараёна: і дзеці, і іх бацькі — часта прыходзілі да школы, назіралі за ходам будоўлі. Унутр, безумоўна, трапіць яны не маглі. Упершыню бацькоў тых дзяцей, якія сёлета пайшлі ў першы клас (а такіх налічваецца 600) запрасілі ў жніўні на сход. І тое, што людзі ўбачылі, вельмі іх уразіла. Пагалоска аб выглядзе школы — знешнім і ўнутраным, вучэбным абсталяванні ды іншым хутка разнеслася па раёне. І адразу з'явілася шмат ахвотных навучаць дзяцей менавіта ў першай школе. Аднак задаволіць просьбы такой колькасці людзей адміністрацыя навучальнай установы не змагла. За школай замацаваная канкрэтная тэрыторыя. І дзяцей, якія замацаваны за іншымі школамі, запісвалі толькі пры наяўнасці свабодных месцаў. Так і атрымалася, што школа імя Грыцаўца ажыццявіла самы вялікі набор навучэнцаў ва ўсёй Брэсцкай вобласці. Напрыклад, тут налічваецца 10 першых класаў, 8 другіх і г. д. Увогуле, у першай школе могуць навучацца 1020 дзяцей у змену.

— Але сапраўдны фурор адбыўся ў школе першага верасня, — працягвае Марына Георгіеўна. — Калі дзеці і іх бацькі пасля ўрачыстай лінейкі ўбачылі тыя ж дынамічныя падлогі, навучальныя пляцоўкі ў калідорах, тэлевізары, відэапраектары ў кожным кабінеце, камп'ютары, спартыўны комплекс і многае іншае, яны прыйшлі ў захапленне. А мы, настаўніцкі калектыў, падрыхтавалі і іншыя сюрпрызы. Да ўвагі дзяцей і бацькоў быў прадстаўлены цэлы шэраг экспазіцый. Напрыклад, прысвечаная 17 верасня — Дню народнага адзінства. Экспазіцыя твораў нашага настаўніка мастацтва Алены Шмырынай. Экспазіцыя пад назвай «Гісторыя буквара», дзе акрамя падручнікаў былі прадстаўлены рэчы, з якімі хадзілі ў школу дзядулі і бабулі сучасных навучэнцаў. Памятаю, як адзін маленькі хлопчык спытаў у настаўніцы: «А дзе гэта ўсё можна купіць?!» Адным словам, першага верасня ў нашай школе атрымалася сапраўднае свята, якім былі вельмі задаволены і дзеці, і іх бацькі.

Нягледзячы на тое, што ў школе ёсць шмат чаго цікавага, карыснага і нават незвычайнага, я лічу, што нашай самай значнай каштоўнасцю з'яўляюцца дзеці, якіх навучае выдатны — не пабаюся, калі так яго ахарактарызую — педагагічны калектыў.

Сяргей РУЧАНАЎ.

«А ненавісныя «начаткі» парваў па самыя акладкі»

ЯК ЛІТАРАТУРНЫЯ ГЕРОІ ІШЛІ Ў ШКОЛУ

Пачатак восені, першыя школьныя дні... Букеты, банцікі, касцюмчыкі, заплечнікі з планшэтамі...
Героі беларускай літаратуры таксама адпраўляліся ў школу, вось толькі выглядаў пачатак іх вучэбнага года часта зусім іначай.
Давайце паглядзім, што давялося перажыць у першыя вучэбныя дні героям беларускай літаратуры?

Схаваць падручнік у снег

Героі паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» сваё навучанне пачыналі проста ў хаце. Бацька-ляснік наняў ім настаўніка — «дарэктара», суседскага хлапчыску Яську.

«А сам дарэктар,
з вузел ростам,
Ў сваім уборы бедным,
простым,
У зрэбных портках і кашулі,
Стаяў, як бы яго прыгнулі,
Такім мізэрным
і маўклівым,
У халаце суконным сівым».

Напачатку лесніковы хлопцы пабойваліся «дарэктара», але той «выдаўся мяркоўны І лепшы нават, як свой кроўны». Вось толькі ў аднаго з вучняў, Алеся, ніяк не ладзіцца з Законам Божым. І хлопец знаходзіць выйсце: знішчае падручнік.

«А ненавісныя «начаткі»
Парваў па самыя акладкі:
«Вось вам, Абрам,
Ісак і Якаў!
Паплачце вы,
бо я ўжо плакаў!»

Псоту кніжак удалося зваліць на катоў, але вось незадача: бацька купіў Алесю новы падручнік.

«— Глядзі ж ты іх цяпер,
як вока:
Папруга ўжо не так далёка;
Калі каты іх зноў парвуць,
То пухіры тут паўстаюць! —
І тое месца сына-блазна
Айцец паказвае выразна».

Алесь і гэтыя «начаткі» закінуў у снег... І здабыў усёткі бацькавай папругі.

Расплаціцца чубам за Адама і Еву

Незадача атрымалася з біблейскімі персанажамі ў школе і ў Міколкі-Паравоза, героя аповесці Міхася Лынькова. Святар, выкладчык Закона Божага, расказваў, як Бог стварыў Адама, а з яго рабрыны — Еву.

«Слухаў, слухаў Міколка ды — у рогат. Так і пусціўся ў смехі, аж да скамейкі прысядае. Раз'ярыўся поп, наступае грозна на Міколку:

— Ты чаго, ірад, з Божага слова смяешся?

А Міколка не сціхае, рагоча, заліваецца. І як не смяяцца яму. Узгадаў ён пра Адама і Еву. Не пра тых, з якімі Бог займаўся, а пра самых звычайных. Пра стрэлачніка Адама і прыбіральшчыцу Еву, якая дэпо падмятала. Худзюшчыя абодва, толькі рэбры ды косці... А поп ужо за вуха Міколкава ўзяўся:

— Кінь смяяцца, кажу!

— То як жа кінуць, калі смешна... Калі Адам і Ева ў нас такія хударлявыя, што Богу і клопату не было з імі, ці доўга іх стварыць... А вось як гэта Бог «буржуя» стварыў, няйначай тры дні пацеў».

Пачуць пра «храпкен» ад «пана навучыцеля»

Школьныя гады Янкі Брыля прайшлі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Польшчы. І шмат у якіх творах ён апавядае пра школу, дзе нельга было размаўляць на сваёй мове, называцца беларусам. У аповесці «Золак, убачаны здалёк» шмат аўтабіяграфічнага:

«Школа стаяла трохі наводшыбе, бліжэй да гасцінца. Стары, шэры даміна пад гонтавым дахам, з незвычайнымі для вёскі вялікімі вокнамі. Адзін пакой на ўсе тры класы, калідор, у якім мы распраналіся, і пакойчык настаўніка. Раней, для нашых бацькоў ці старэйшых сямейнікаў, школа была рускай, царкоўнапрыходскай, а для нас яна стала польскай, «паўшэхнай», і арудаваў тут малады паляк, які нядаўна прыехаў недзе з-пад Кракава ці Жэшува, каб тут на новы лад даводзіць нам, што мы — дзеці народа без імені, без роднай мовы».

У такой школе вучыцца і Данік Малец з аповесці «Сірочы хлеб». Навучанне вядзецца на польскай. «Літары даліся хлопцу няцяжка. Толькі з дзвюма з іх Данік, як і ўсе іншыя навічкі, меў многа клопату. Нейкае «а з хвосцікам» і «э з хвосцікам»; першае трэба вымаўляць як «не то а, не то он», а другое — «не то э, не то эн»... Так муштраваў іх настаўнік. І вымаўляць удавалася толькі яму. Малыя неўзабаве вырашылі, што тут уся справа ў носе — які ў каго нос. У пана Цабы нос быў доўгі, чырвоны, і настаўнік гугніў у яго неяк вельмі ж адмыслова. А ў іх яно так не выходзіла гладка — ні «он», ні «эн»...»

Аднойчы вучыў Данік верш, як польскі хлопец Янэк хваліўся сваёй маме, што ён наловіць многа рыбы.

«Ловіл Янэк до полудня,
Маёнц пружнон храпкэн...»

І ніяк бедны Данік не мог уцяміць, што за той «храпкен»? Сваякі і сябры прапаноўвалі самыя розныя тлумачэнні — а ці не храпа гэта каня? Так і не даўмеліся.

Трапіць на анлайн-лекцыю сто гадоў таму

Бадай, самую незвычайную школу апісаў Янка Маўр у 1932 годзе ў творы «Аповесць будучых дзён». Хлопчык Юзік жыве ў панскай Польшчы. Ён з бацькамі — бяспраўныя слугі злоснага пана. Юзіку ўдаецца крадма забрацца ў самалёт і трапіць у савецкую Беларусь. Маўр не шкадуе ўтапічных фарбаў, малюючы рэальнасць, якая не мае нічога агульнага з тагачасным калгасным жыццём. Сяляне жывуць у палацах, сядзяць у касцюмчыках з гальштукамі на верандах, п'ючы каву. Догляд кароў сумяшчаюць з напісаннем навуковых артыкулаў. Трапляе Юзік і ў тамтэйшую школу, і тут застаецца падзівіцца, наколькі Маўр дакладна апісаў правядзенне сучасных анлайн-лекцый.

«Яны ўвайшлі ў пакой без акон, з радамі крэсел з экранам наперадзе. Відаць было, што гэта — кіно, толькі перад крэсламі стаялі столікі-пюпітры для пісання. Паступова крэслы запаўняліся людзьмі, галоўным чынам моладдзю, але былі людзі і больш за трыццаць гадоў.

Юзік ніяк не мог зразумець, што тут: ці школа, ці кіно і з цікавасцю чакаў, што будзе далей. Вось святло згасла. На экране паказаўся чалавек, побач з ім класная дошка. Чалавек паварушыўся трохі, абапёрся аб свой стол і... загаварыў! Загаварыў звычайным голасам, як кожны чалавек: «Мінулы раз мы з вамі спыніліся, здаецца, на раскладанні ў рады трансцэндэнтных функцый...» І пайшоў, і пайшоў крыць...

Перад слухачамі на сталах былі маленькія лямпачкі пад каптурамі. Калі іх запаліць, яны асвятлялі толькі сшыткі і больш святла не давалі. Кожны раз, калі трэба было запісваць, слухач запальваў гэтую лямпачку».

Як патлумачылі Юзіку, прафесар «Чытае лекцыі ў Менску, а тут бачаць і слухаюць. Навука даўно ўжо злучыла радыё і кіно».

XIV · ДАРЭКТАР

Зварот пары, зніканне лета...
То — водгулле душы паэта,
То — смутны вобраз развітання,
То — струн дрыгучых заміранне,
Натхненнай песні жаль сардэчны.

148

Слухаць навіны з фронту і чакаць Перамогі

Калі ў школу пайшлі героі апавядання Вячаслава Адамчыка «Урок арыфметыкі», яшчэ не скончылася вайна, ва ўсім былі бачныя яе рэаліі:

«Кожнае раніцы, перад першым урокам, уся школа выстройвалася ў калідоры, і вучань з дзясятага класа, лысы і, мне здавалася, гэтакі самы стары, як усе настаўнікі, чытаў нам зводкі Саўінфармбюро. І я ўяўляў, як нашы салдаты лёгка бяруць гэтыя белыя з чырвонымі чарапічнымі дахамі нямецкія гарады, якія бачыў я на паштовых картках, што прысылаў недзе з фронту з Германіі да мае мамы яе брат — мой дзядзька.

...Наша школа пахла лякарствам, і ля плота валяліся доўгія бінты, парудзелыя ад крыві, — казалі, што ў нашай школе размяшчаўся медсанбат, — і скрозь па ямах у смецці ржавелі пустыя кулямётныя ленты, падобныя на хрыбты нейкіх страшэнных вужакаў.

За школаю едкім, удушлівым гарам пахла свежае пажарышча, і ў тонкай сасне маладою цягучаю смалою заплываў незаржавелы асколак ад бомбы.

Успамінак пра вайну прыносілі ў нашу школу і настаўнікі: на іх было ўсё вайсковае — кірзавыя боты, зялёныя не перашытыя яшчэ галіфэ, кіцелі з петлямі ад нядаўніх пагонаў.

У фізрука на галаве тонкаю маладою скуркаю дыхала глыбокая рана. Ён расказваў нам, як хадзіў у тыл да немцаў браць «языка». Пра рану ў яго мы чамусьці не пыталіся».

Зрабіць сшыткі са шпалераў

Героі аповесці Івана Сяркова «Мы — хлопцы жывучыя» вяртаюцца ў сваю школу пасля вызвалення ад фашысцкай акупацыі, перажыўшы яе жахі.

«Мы прыбраліся ў школу, як хто мог. Санька ў новай кашулі з парашутнага палатна. Цётка Марфешка яе на пуд жыта выменяла. Смык у штанах з брызентавай салдацкай плашч-палаткі. Яны моршчацца гармонікам, і ніякай сілай іх не разраўняеш...

Кніжак мы сабе з Санькам так і не купілі. А сшыткі ёсць: два куплёныя ды яшчэ самаробныя са шпалераў. Тоўстыя, як Біблія. Старонка чыстая, старонка размаляваная блакітнымі кветкамі — пішы і любуйся...

Санька крыху багацейшы за нас з Глыжкам. Добра ж яму, калі немцы, як стаяў у іх афіцэр, абляпілі іхнюю хату белай паперай. Начальству не падабаліся абшарпаныя сцены. А цяпер, перад школай, гэта Саньку як знаходка. Пакуль маці была ў полі, ён навёў свой парадак у хаце — абадраў сцены, ні шматка не пакінуў. Было яму ад маці! Мы з хлопцамі нават на вуліцы чулі, як Марфешка крычала:

— Ах ты, лядашчэ! Ах ты, гайдамака!

Санька ўсё гэта мужна перажыў. Затое зараз і ў вус не дзьме: мае сшыткі і блакноцікі.

Так мы падрыхтаваліся да школы».

Сустрэць каханне ўсяго жыцця і быць пастрыжаным

Народны пісьменнік Іван Шамякін менавіта ў школе напаткаў каханне ўсяго свайго жыцця. У аповесці «Слаўся, Марыя!», прысвечанай нядаўна памерлай жонцы, ён распавядае гісторыю іх знаёмства.

«Школа змяшчалася ў былым папоўскім доме, два класныя пакоі, займаліся паралельна пяты і сёмы, шосты — у другую змену; «першая ступень», як называлі малодшыя класы, вучылася ў дарэвалюцыйнай школе, маленькай, струхнелай, халоднай.

Мяне пасадзілі з двума хлопцамі, імёны якіх я не помню. Але імёны траіх дзяўчат, якія сядзелі за маёй партай, захаваліся на ўсё жыццё. Як не помніць! Маша Кротава! Ліда Блінцова, Тамара Дзегцярова.

Маша была маленькая, рыжанькая, з вялікімі блакітнымі вачамі, вельмі жывымі, выразнымі, у іх адбіваліся ўсе яе пачуцці — здзіўленне, радасць, расчараванне, крыўда. Маша была самая ціхая і самая далікатная, пасучаснаму сказалі б — інтэлігентная. Былі такія дзеці і ў сялянскіх сем'ях».

Вось Маша Кротава і стала абранніцай будучага пісьменніка.

«Я даваў ёй — не языкатай Тамары — рашэнне задач, яна, заглядваючы праз плячо, неяк вельмі ўмела паказвала на мае памылкі ў дыктантах».

Гэты выбар быў не выпадковы... Аднойчы дырэктар школы, які неаднойчы казаў Івану Шамякіну пастрыгчыся, вырашыў здзейсніць «выхаваўчую працэдуру».

«Прынёс вялікія нажніцы — казалі, авечыя, — пасадзіў мяне на перапынку на табурэт і пачаў сам стрыгчы... Большасць вучняў зларадна смяялася — дзеці жорсткія — і кідала ўедлівыя жартачкі: «Стрыгуць, як барана». І толькі адна худзенькая дзяўчынка не смяялася, яна стаяла насупраць, на твары яе адбівалася пакута, быццам стрыглі яе самую, а ў шырокіх, заўсёды як бы здзіўленых вачах плавалі слёзы. Гэта была Маша. Яна спачувала мне, шкадавала, бадай жа, па-матчынаму. Яе спагада кранула маё «ачарсцвелае» сэрца. Расчулены, я ледзьве ўтрымаўся, каб не зараўці. І, помню, падумаў: «Во адзіны сапраўдны сябра. Даражэй за сястру. Цяпер адной ёй буду паказваць рашэнне задач».

* * *

Гэтымі днямі тысячы беларускіх школьнікаў пасля летніх вакацый вярнуліся ў свае класы. Няхай жа там адбудуцца іх шчаслівыя сустрэчы з беларускай літаратурай!

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

КЛЕЙНБАРТ ВЯРТАЕЦЦА Ў КАПЫЛЬ

У час XXVIII Дня беларускага пісьменства ў Капылі 5 верасня пройдзе прэзентацыя кнігі Льва Клейнбарта «Сустрэчы. Янка Купала», якая пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда». Месца правядзення — Капыльскі раённы краязнаўчы музей. Пачатак — у 14.45.

Гэтую падзею, як і выданне кнігі, можна назваць знакавай праявай увагі і да постаці народнага песняра Беларусі, і да даследчыка яго творчасці — рускага літаратурнага крытыка, пісьменніка, публіцыста, журналіста Льва Максімавіча Клейнбарта. Нагадаем, што ён з'яўляецца ўраджэнцам Капыля. Рукапіс кнігі «Сустрэчы. Янка Купала» з 1964 года з'яўляецца часткай музейнага збору. У фонды Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы кніга трапіла дзякуючы пляменніцы народнага песняра Ядвізе Юльянаўне Раманоўскай (яна ў 1960—1986 гг. працавала галоўным захавальнікам фондаў Купалаўскага музея). Менавіта яна вяла перапіску з братам Льва Клейнбарата — Маркам Максімавічам, які на той час з'яўляўся ўладальнікам часткі архіва даследчыка і перадаў рукапісы на захаванне ў музей.

Чытаем у прадмове да выдання «Сустрэчы. Янка Купала»: «Праца па набыцці матэрыялаў з асабістага архіва літаратурнага крытыка Льва Клейнбарата распачалася яшчэ ў 1940-я гады Уладзіславай Францаўнай Луцэвіч. Іх перапіска — сямнаццаць пісьмаў — сёння захоўваецца ў фондах Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. «Я ведаю, што вы, дарагі Леў Максімавіч, заўсёды былі лепшым сябрам Янкі і цяпер памятаеце яго», — пісала У. Ф. Луцэвіч. Леў Максімавіч Клейнбарт адказваў: «І. Д. Купала быў з даўніх часоў маім літаратурным сябрам... Мною напісаны вялікія ўспаміны пра Купалу, дзе выкарыстаны ў першую чаргу яго лісты да мяне, а затым лісты пра яго знакамітых беларусаў. «Сустрэчы» гэтыя выйдуць у нашых рускіх выданнях, але я бы хацеў, каб яны выйшлі і ў перакладзе на беларускую мову».

Наша публікацыя ўспамінаў Льва Клейнбарта не толькі ў арыгінале, але і па-беларуску — ажыццяўленне шчырага жадання аўтара падзяліцца сваім успрыманнем асобы Янкі Купалы — паэта, грамадскага дзеяча, блізкага і дарагога чалавека.

Леў Максімавіч Клейнбарт — аўтарытэтны літаратурны крытык свайго часу, чые працы актуальныя і сёння для сучасных даследчыкаў літаратуры ў цэлым, літаратурных персаналій у прыватнасці. Раней не апублікаваная работа Л. М. Клейнбарта «Сустрэчы. Янка Купала», без сумнення, прыцягне ўвагу і навукоўцаў-купалазнаўцаў, і простых чытачоў, тых, хто зацікаўлены беларускай літаратурай, гісторыяй краіны. Яна напісана прыгожай і зразумелай мовай, якая раскрывае перад намі аўтара як назіральнага, вельмі ўважлівага, тонкага апавядальніка з безумоўным літаратурным дарам».

Леў Клейнбарт праз сваю кнігу вяртаецца ў родны Капыль. Выданне, прэзентацыя ў раённым краязнаўчым музеі, у горадзе, дзе яшчэ засталіся сляды сядзібы Клейнбартаў (вось бы там зрабіць мемарыяльны музей! І мо не аднаго толькі Клейнбарта, а ўвогуле — Капыльскі літаратурны музей!) — ураўлівыя пазнакі беларускага асветніцтва, беларускай культуры. А яшчэ — напамін пра тое, што праз кнігі, мемарыяльныя дошкі, музейныя экспазіцыі варта было б вярнуць многія імёны дзеячаў культуры, асветніцтва з XX стагоддзя, першых яго дзесяцігоддзяў.

Д. Полазаў. «Партрэт Я. Купалы». 1921. Ілюстрацыя з кнігі.

Відавочна, напрыклад, што мала адных толькі згадак у друку пра Міколу Каспяровіча, арганізатара беларускага краязнаўства ў 1920-я гады. Патрэбны асобны яго музей — ці ў Мінску, ці ў Віцебску, дзе ён працаваў, ці на Пухавіччыне, дзе ён нарадзіўся, ці ў Чэрвені, дзе ён вучыўся ў павятовым вучылішчы. Патрэбна перавыдаць яго ўнікальную, актуальную і цяпер кнігу «Краязнаўства». А Браніслаў Тарашкевіч, Браніслаў Эпімах-Шыпіла, а Мітрафан Доўнар-Запольскі — ці ўганаравана належным чынам памяць пра гэтых волатаў, іх справы?! Імёнаў можна называць шмат...

Мікола БЕРЛЕЖ.

Партрэты

СЛОВА Ў ЧАСЕ І Ў МАСТАЦТВЕ

Літаратура заўсёды была і застаецца тым люстэркам, дзе можна ўбачыць час з яго тэндэнцыямі і выклікамі, тэмы, што хвалююць чалавека і разам з тым раскрываюць яго як асобу... Мастацкая выстаўка жывапісца Віктара БАРАБАНЦАВА «Літаратурныя партрэты эпох», якая адкрылася ў Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь, якраз і дае магчымасць згадаць, а можа, і адкрыць для сябе імёны выдатных дзеячаў беларускай літаратуры. А своеасаблівым компасам, каб сарыентавацца ў іх творчасці, з'яўляецца дакументальна-літаратурная экспазіцыя Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры «Жыццё ў слове». Абодва праекты прымеркаваныя да Дня беларускага пісьменства.

Стваральнікі выстаўкі «Жыццё ў слове» зрабілі спробу лаканічна і разам з тым цікава прадставіць гісторыю айчыннага і сусветнага кнігадрукавання ад Скарыны і да класікаў XX стагоддзя.

Калі застаешся адзін на адзін перад партрэтамі беларускіх пісьменнікаў аўтарства Віктара Барабанцава, заўважаеш, як каларытна імкнецца мастак прадставіць сваіх герояў гледачу.

— Дзень беларускага пісьменства — гэта сапраўды свята для ўсіх аматараў беларускай літаратуры. І, безумоўна, яно вельмі блізкае літаратурным музеям і бібліятэкам. Яно практычна выраслa са скарынаўскага свята — менавіта чарговы юбілей першадрукара падштурхнуў да ідэі, якая ўвасобілася ў свята беларускага пісьменства. І наша выстаўка — спроба паказаць беларускую літаратуру амаль за 500 гадоў, усе яе знакавыя творы, пачынаючы ад першадрукаванай кнігі, — дзеліцца **куратар экспазіцыі, загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Вольга ГУЛЕВА.** — Назва праекта «Жыццё ў слове» — цытата з кнігі крытычных артыкулаў выдатнага беларускага пісьменніка Міхася Стральцова. Так яно і ёсць, мы з вамі жывём у слове. Яно дапамагае нам разумець адзін аднаго. А літаратура з'яўляецца жыццяпісам чалавецтва. І пачынаецца жыццё ў слове з самай важнай і галоўнай кнігі — Бібліі. Яе друкаваў Францыск Скарына, і па ёй пачыналі вучыцца. І мы пачалі выстаўку з гэтай кнігі. У экспазіцыі прадстаўлены не толькі кнігі і іх аўтары, а яшчэ і важныя падзеі. Дзве з іх мы адлюстравалі асобна — гэта Першая сусветная і Вялікая Айчынная войны, якія паўплывалі на гісторыю ўсяго XX стагоддзя. Гэтыя найвялікшыя трагедыі выштурхнулі на паверхню шмат таленавітых людзей.

...Кожны банер у экспазіцыі мае свой эпіграф, што можа служыць пэўнай сэнсавай кропкай для разумення прадстаўленых аўтараў і іх твораў. Найперш згадваюцца Мікола Гусоўскі і яго «Песня пра зубра», знакаміты «Катэхізіс» Сымона Буднага, «Беларусь у фантастычных апавяданнях» Яна Баршчэўскага, «Дзяды» Адама Міцкевіча... А вось XX стагоддзе прадстаўлена імёнамі Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа. Прыгадваючы іх творы, пераконваешся, што гэта — сапраўдная крыніца для спазнання мінулага жыцця, якое засталося на старонках кніг.

Асобна прадстаўлена тэма вайны і аўтараў, што пісалі пра яе. «Вайна супярэчыць чалавечай прыродзе. Нішто не можа апраўдаць яе руйнаванні» — цытата з Васіля Быкава стала эпіграфам да старонак знаёмства з тымі літаратарамі, якія паказалі ваенныя падзеі праўдзіва, як той жа Максім Гарэцкі ў сваёй кнізе «Запіскі на імперыялістычнай вайне». Гэты твор змясцілі для параўнання побач з кнігамі замежных класікаў, у прыватнасці Хэмінгуэя, Рэмарка і г. д. Перш за ўсё для іх вайна з'яўляецца трагедыяй, дзе адзін чалавек забівае іншага. Пасля ўскалыхнула нашу краіну Другая сусветная вайна. І сведкамі таго жахлівага перыяду сталі творы Янкі Брыля, Алеся Адамовіча, Васіля Быкава і многіх іншых майстроў слова. «Чалавек — гэта цэлы свет» — менавіта пад такім эпіграфам аб'ядноўваюцца ў экспазіцыі творы Кандрата Крапівы, Івана Мележа, Уладзіміра Караткевіча, Івана Шамякіна, Рыгора Барадуліна...

Вядома, што літаратура — гэта яшчэ і крыніца творчага натхнення для музыкантаў, рэжысёраў і мастакоў. І вось, калі застаешся адзін на адзін перад партрэтамі беларускіх пісьменнікаў аўтарства Віктара Барабанцава, заўважаеш, як каларытна імкнецца мастак прадставіць сваіх герояў гледачу. Ён выступае свайго роду пасрэднікам у вашым знаёмстве, імкнецца, каб адчуваліся яго павага, любоў і захапленне выдатнымі літаратурнымі дзеячамі.

— Цяжка не заўважыць сувязь літаратуры і мастацтва. Калі мы пачынаем глядзець на развіццё беларускай літаратуры, то, напрыклад, Біблію Францыска Скарыны складана ўявіць без сусветна вядомых гравюр. Ва ўсіх эпохах развіцця літаратуры побач заўсёды стаіць мастацтва, — кажа **намеснік старшыні па творчых, арганізацыйных пытаннях Беларускага саюза мастакоў Андрэй БАСАЛЫГА.** — Набліжаючыся да XX стагоддзя, вельмі ярка прасочваецца, у якой сутворчасці знаходзяцца мастак і пісьменнік. І я згадваю свайго бацьку і дзядзьку, яны таксама шмат працавалі як ілюстратары кніг. Мне ж прыемна прадставіць сябра нашага саюза мастакоў Віктара Барабанцава, які доўга і плённа працуе на карысць беларускай літаратуры.

У праекце «Літаратурныя партрэты эпох» ёсць выявы літаратурных і культурных дзеячаў Беларусі Кірылы Тураўскага, Міколы Гусоўскага, Аляксея Дударава, Уладзіміра Карызны, Георгія Марчука, Максіма Багдановіча, Вольгі Іпатавай, Віктара Карамазава і іншых.

— Я пісаў партрэты, а таксама мы пілі чай і размаўлялі з пісьменнікамі на розныя тэмы, — дзеліцца мастак. — Вось, напрыклад, Георгія Марчука я напісаў на фоне Давыд-Гарадка, дзе ён нарадзіўся і пачынаў свае крокі ў літаратуру. А вось Аляксей Дударaў, памятаю, прыйшоў да мяне на сустрэчу нават з нейкімі сваімі тэкстамі, і тут можна ўбачыць яго малюнак да п'есы... Партрэт Міколы Гусоўскага ствараўся паводле асаблівай тэхнікі энкаўстыка, якую выкарыстоўвалі яшчэ ў Старажытнай Грэцыі.

Усе карціны, створаныя рукой майстра, паказваюць нам не толькі канкрэтнага чалавека, але і яго характар, нейкія дэталі, што маюць дачыненне да пісьменнікаў розных перыядаў. Карціны, якія размешчаны ў залах Прэзідэнцкай бібліятэкі, — як з калекцыі самога аўтара, так і з фонду Беларускага саюза мастакоў і Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. І ўбачыць іх пры жаданні можна да 15 верасня.

Алена ДРАПКО.
Фота аўтара.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ О ТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», г. Борисов, ул. Даумана, 95**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов

Наименование	Инв. номер	Место-нахождение	Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб.
Легковой хэтчбек Skoda OCTAVIA, 2012 г. в., рег. знак 6599 IM-5, комплект сменной летней резины (4 колеса)	14526599	г. Борисов, ул. Даумана, 95	12 334,75

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение 3 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 03.08.2021

Дата и время начала и окончания электронных торгов: **24.09.2021 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **22.09.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **Государственное предприятие «Слава труду»** (УНП 500056012), 231482, Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Козловщина, ул. Советская, 74а, тел./факс: (01563) 30-1-95, в лице антикризисного управляющего частного предприятия «Правовой путь».

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **27 сентября 2021 г. 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

№ п/п	Лот №	Предмет торгов	Год выпуска	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС
1	16410	Беларус-1221В.2	2005	7 200,00
2	16411	Беларус-1221В	2005	7 000,00
3	16412	МАZ 555102 225	2005	10 900,00
4	16413	МАZ 555102 220	2005	9 900,00
5	16414	Беларус-1221В	2006	7 700,00
6	16415	МАZ 555142 4227	2006	14 100,00
7	16416	Беларус-1221В.2	2006	5 600,00
8	16417	МАZ 555142 42228 РБ	2007	15 200,00
9	16418	МАZ 533603-220 Р	2007	13 900,00
10	16419	Беларус-3022ДЦ.1	2009	35 100,00
11	16420	МАZ 555142 4231РБ	2009	17 800,00
12	16421	МАZ 555142 4231РБ	2009	17 800,00
13	16422	Беларус-3022ДЦ	2010	43 800,00
14	16423	VAZ-21213	2000	3 700,00

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 06.09.2021 г. 09.00 по 24.09.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Ликвидатор частного предприятия «СКВОЗЬ ВРЕМЯ»
(УНП 192840238, г. Минск)
в связи с ликвидацией объявляет о проведении
15.09.2021 г. в 12.00
третьих повторных торгов в форме аукциона по адресу: Минск, ул. Л. Беды, 29, помещение 1Н по праву имущества частного предприятия «СКВОЗЬ ВРЕМЯ»:

ЛОТ № 1. МАШИНА ВЫСОКОЙ ПЕЧАТИ Taiyo Label Printing Press TLS-250-8C+1F.

Начальная стоимость: 65 000 руб., **без НДС.**

Шаг торгов – 5 %. Задаток в размере 5 % от начальной цены лота перечисляется по следующим реквизитам: УНП 192840238, р/с BY 95 OLMP 3012 0001 3154 1000 0933 в ОАО «Белгазпромбанк» г. Минск, ул. Притыцкого, 60, корп. 2, БИК OLMPBY2X.

Договор купли-продажи предмета торгов может быть заключен с единственным участником торгов с увеличением стоимости соответствующего лота на 5 %.

Договор купли-продажи предмета торгов заключается в течение 1 рабочего дня со проведения торгов. Оплата по договору купли-продажи предмета торгов осуществляется в течение 1 банковского дня с момента подписания договора. Предмет торгов по договору купли-продажи предмета торгов передается покупателю в течение 1 дня с момента полной оплаты.

Имущество находится в г. Минске. Вся информация и порядок осмотра согласовываются по телефонам, указанным ниже.

Заявления на участие в торгах направляются по адресу: 220040, Минск, ул. Л. Беды, 29, пом. 1Н или по электронной почте info@likvidator.by в срок до 17.00 14.09.21 г. Справки по тел.: +375 29 148-01-01 («Вайбер», «Телеграм»); +375 29 763-97-34 («Вайбер», «Телеграм»).

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества Государственного предприятия «АКАДЕМФАРМ» (Продавец)

ЛОТ № 1: ЛЕГКОВОЙ ХЭТЧБЕК SKODA RAPID,

кузов (рама) № XW8AC2NH8JK137560, г. в. – 2018.

Начальная цена с НДС – 20 764,08 руб.
Местонахождение: г. Минск, ул. академика В.Ф. Купревича, д. 5, корп. 3.
Аукцион состоится 20.09.2021 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.
Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Организатора аукциона ino.by.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

Могилевский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
информирует о проведении 21.09.2021 г. открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Компания «МогНат»

Лот № 1: капитальное строение с инв. № 700/С-68770 – котельная, пл. – 687,6 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-68772 – мазутонасосная**, пл. – 41,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91634 – склад**, пл. – 44,2 кв. м. **Емкость металлическая 80 м³,** инв. № 5283; **Участок наружной канализации протяженностью 137,1 м** (инвентарный № 700/С-90642). Лот № 1 расположен по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64, на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 (пл. – 0,4562 га). Отдельный земельный участок под обслуживание лота не выделен.

Начальная цена продажи: 111 072,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 11 107,20 бел. руб.

Аукцион состоится 21 сентября 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к.352. Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by.

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 351, 352, тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**

Могилевский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
информирует о проведении 07.10.2021 г. открытого аукциона по продаже имущества РУП «Белоруснефть-Могилевоблнефтепродукт»

Лот № 1: трактор Беларус-320 МО 3103384 МПУ-320, 2009 г. в., р/з ТА-6 7204 (складской № по бух. учету 555890).
Начальная цена продажи: 2 523,70 бел. руб.
Лот № 2: прицеп специальный ПС-30, 2007 г. в., р/з МЖ 4464 (складской № по бух. учету 555717).
Начальная цена продажи: 2 352,67 бел. руб.
Лот № 3: автомобиль грузовой тентовый Volkswagen Crafter, 2008 г. в., р/з АВ 0756-6 (складской № по бух. учету 83580).
Начальная цена продажи: 9 762,52 бел. руб.
Лот № 4: комбинированный почвообрабатывающий агрегат LEMKEN, 2007 г. в., (складской № по бух. учету 555705).
Начальная цена продажи: 22 806,21 бел. руб.
Аукцион состоится 07 октября 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, на сайте Могилевского облисполкома mogilev-region.gov.by и на сайте Организатора аукциона ino.by.
Организатор аукциона**: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.
Доп. информацию можно получить по тел**: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «КРАСНОСЕЛЬСКИЙ ТОРГ»

	Лот № 1		Лот № 2	
Предмет торгов, краткая характеристика	**Капитальное строение, инв. № 410/С-23582** (здание пункта приема стеклотары), общей площадью 343,7 кв. м, кирпич, 1980 г. п.		**Капитальное строение, инв. № 410/С-22721*** (склад мебели), общей площадью 595,7 кв. м, металл, кирпич, 1985 г. п.	
Информация о земельном участке	кадастровый номер 420855700001000204, площадь – 0,0521 га		Кадастровый номер 420855700001000203, площадь – 0,0818 га	
Местонахождение имущества	Гродненская обл., Волковысский р-н, г. п. Красносельский, ул. Кирова, 6		Гродненская обл., Волковысский р-н, г. п. Красносельский, ул. Кирова, 8	
Начальная цена с учетом НДС	**30 214,12 рублей**	Задаток (5 %) – 1 511,00 руб.	**39 723,08 рублей**	Задаток (5 %) – 1 986,00 руб.

Сведения о продавце: ОАО «Красносельский торг», г. п. Красносельский, ул. Короткая, 28, тел. 8 (01512) 63808

Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, УНП 500481906, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X

Торги состоятся 4 октября 2021 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8

Срок подачи документов: **по 28 сентября 2021 г. включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8**

Аукцион без условий. Шаг аукциона 5 %. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 календарных дней с момента проведения аукциона. **Условия оплаты:** в течение 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи. Условия участия и порядок проведения аукциона по тел. 8 (0152) 621632 и на сайте www.fincentr.by.

** – Сдаются в аренду помещения: 120 кв. м – по 28.02.2023 г., 40 кв. м – по 31.01.2022 г., 23 кв. м – по 31.03.2023 г.*

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

Государственным предприятием

«БелЮрОбеспечение» (192821149)

назначено проведение электронных торгов

Организатор	Общество с ограниченной ответственностью «Громар»
Предмет	Лот № 9.2021.10.00006. Готовый бизнес ООО «Громар» и ООО «Августовский бекон»
Место нахождения	Гродненский район, г. п. Сапоцкин, ул. Вильчинского, 38А
Начальная стоимость	2 100 000,00 белорусских рублей без НДС

Торги будут проведены 05.10.2021 с 9.00 до 18.00 на ЭТП e-auction.by.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости лота должен быть зачислен после аккредитации (верификации) заявителя на ЭТП в срок до 16.00 04.10.2021.

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ЧЕРВЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

№ лота	Сведения о виде и предмете аукциона	Адрес объекта и его наименование	Сроки аренды	Начальная цена объекта *(рублей)*	Сумма задатка *(рублей)*	Расходы по организации и проведению аукциона *(рублей)*	Ограничения *(обременения)* прав в использовании земель и другие ограничения
1	Аукцион на право заключения договора аренды земельного участка	Земельный участок для строительства и обслуживания объекта производственно-складского назначения, расположенный по адресу: Минская обл, Червенский р-н, район д. Барсуки, площадь 0,7757 га, кадастровый номер 625883000601000044	99 лет	1 535,88	153,56	3873,13 + расходы по размещению извещения в СМИ	Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране – площадь 0,7757

Задаток перечисляется на расчетный счет BY94 AKBB36410627000026000000 в ЦБУ 627 филиала № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 600008398. Оплата объекта аукциона (включая затраты, связанные с его проведением) должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. Для участия в аукционе представляются: заявление, документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка, а также иные документы, предусмотренные Положениями о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков и продажи земельных участков в частную собственность, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. При подаче заявления заключается соглашение с райисполкомом о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников.

Аукцион состоится **04 октября 2021 года** в 11.00 в здании Червенского райисполкома (зал заседаний) по адресу: г. Червень, пл. Свободы, 1. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Червень, пл. Свободы, 1, райисполком, кабинет 71, тел. 80171428486 **по 1 октября 2021 года включительно.**

БЕГАЦЬ ТРЭБА З ГАЛАВОЙ І... БЛІЗКІМ ЧАЛАВЕКАМ

Ніна і Дзмітрый САВІНЫ раскрываюць сакрэты сямейнага бегу

Знакаміты выраз пра тое, што рух — гэта жыццё, кожны разумее па-свойму. А Ніна Савіна ўспрымае яго ў прамым сэнсе. Ніна — пераможца Кубка Еўропы ў бегу на 10 000 метраў, бронзавы прызёр Варшаўскага паўмарафону, пераможца Мінскага паўмарафону 2019 года і яшчэ мноства забегаў. Адразу пасля марафону на Алімпійскіх гульнях у Токіа яна стала рыхтавацца да Мінскага паўмарафону. Увогуле, у сям'і Савіных бег вельмі любяць. Дзмітрый Савін, малодшы брат Ніны, таксама абраў яго сваім заняткам па жыцці. Ці сапраўды спорт — гэта ў іх сямейнае, Ніна і Дзмітрый расказалі «Звяздзе». І бонусам падзяліліся сакрэтам, як падрыхтавацца да Мінскага паўмарафону.

ДА ФІНІШУ — БАСАНОЖ

«Мы выраслі ў вёсцы, і там было няшмат спартыўных секцый. Дакладней, іх увогуле не было. Займаліся звычайнай фізкультурай на школьных уроках, мне гэта падабалася. У сёмым класе я заняла другое месца ў двухкіламетровым забегу. І трэнер прапанаваў мне заняцца бегам больш сур'ёзна. Я тады мала разумела, што такое спорт, што такое выносліваць. Не зусім разумела, чым хачу займацца. Але пагадзілася. Такая вось банальная гісторыя», — расказвае Ніна пра пачатак сваёй спартыўнай кар'еры. Але бег так захапіў дзяўчынку, што яна бегала нават босай. «Раніцай перад кросам не змагла апрануць красоўкі. Невядома чаму, распухла стапа. Мне прапаноўвалі большы па памеры абутак. Але як у ім бегчы? Ну я і пабегла басанож. І нармальна прабегла. Адчуванні, канешне, не самыя прыемныя, але ўсё добра атрымалася. Каманду нельга было падвесці — патрэбныя былі балы», — успамінае Ніна. А потым было паступленне ў Бабруйскае вучылішча алімпійскага рэзерву, і спаборніцтвы, і перамогі. І «звычайныя» форс-мажоры спорту: бег праз боль, ступары на дыстанцыі, выступленні на маральна-валявых якасцях.

«ЗРАЗУМЕЎ, ШТО ТАКОЕ ЦЯРПЕЦЬ»

У Дзмітрыя выбару было крыху больш. У сярэдняй школе, дзе ён вучыўся, працавалі розныя спартыўныя секцыі. Магчыма, у яго асобе краіна згубіла таленавітага біятланіста — у школьныя гады ў хлопца добра складваліся адносіны з гэтым відам спорту. Але настаўнік фізкультуры звольніўся, і кар'ера біятланіста ў Дзмітрыя Савіна завяршылася. Аднак пачалася бегавая кар'ера. Ніна, якая ўжо вучылася ў вучылішчы, запісала брата ў летні лагер для абітурыентаў. Усё лепш, чым сядзець дома на канікулах. «У летніку я паспрабаваў бегаць. Не скажу, што вельмі атрымлівалася, але мне спадабалася. Мяне на адзін год

пакінулі як абітурыента, каб паглядзець, на што я здольны. Спачатку, вядома, не ўсё было добра, дзяўчатам прайграваў. Але потым вырас, набраў форму», — расказвае Дзмітрый. Перыяд пройгрышу дзяўчатам быў нядоўгі. Праз год Дзмітрый стаў трэцім на рэспубліканскіх спаборніцтвах па бегу на 2000 метраў з перашкодамі і быў афіцыйна залічаны ў Бабруйскае вучылішча алімпійскага рэзерву. А затым у Жлобіне адбыўся старт, які прадвызначыў спартыўную кар'еру і стаўленне да бегу. «Быў турнір да Дня металурга. І там я зразумеў, што такое цярпець. Я ў тым забегу быў самы малодшы. Рэзка стартануў, і пасля двух кіламетраў мне стала дрэнна, але бег далей. Дагнаў аднаго чалавека, бачу, наперадзе — яшчэ адзін, даганяю і яго. Там я зразумеў, што хоць і цяжка, але трэба бегчы. І тады паказаў нядрэнны вынік для свайго ўзросту, пабіў уласны рэкорд. А самае галоўнае — зразумеў, што значыць цярпець», — дзеліцца Дзмітрый. Пачаліся поспехі на рэспубліканскіх спаборніцтвах, запрашэнне на зборы ў Кіславодск, чэмпіянат Еўропы. Кар'ера Дзмітрыя Савіна набрала абароты. Таксама імкліва яна развівалася і ў Ніны.

«МАМА БЫЛА ЎСІМІ РУКАМІ ЗА»

Любоў да спорту ў Савіных — гэта сямейнае. Бацькі таксама цікавіліся і займаліся спортам, але прафесіяй ніхто яго не зрабіў. Мама займалася веласпортам, але загінуў трэнер, і працягу гэтыя заняткі не атрымалі. Таму жаданне дзяцей стаць спартсменамі яна не абмяжоўвала. Ніне сказала, што гэта цалкам яе выбар і адказнасць. Дзіму актыўна падтрымала.

— Мама была ўсімі рукамі за. Мне здаецца, як і любой маці, у якой расце хлопчык, ёй хацелася накіраваць яго энергію ў правільнае рэчышча. І спорт для гэтага — найлепшы варыянт, — разважае Ніна.

— Мама была настолькі за, што ўсё за мяне вырашала. Больш за мяне цікавілася залічэннем у вучылішча, — усміхаецца Дзіма.

Вялікую ролю сыграла і тое, што дзеці былі разам, пад наглядам. Якая маці будзе супраць? «Я ездзіла па спаборніцтвах больш, чым Дзіма. І калі прыязджала, мне ўсё расказвалі пра яго. Я з братам не вельмі цырымонюся. Часам сама сабе думаю: «Можа я залішне на яго цісну. Але інакш не магу. Я з дзяцінства яго даглядаю, ён заўсёды для мяне «малодшы брацік». Часам мне здаецца, што я занадта дакучліва сябе з ім паводжу. Усё ж такі яму 19 гадоў, дарослы хлопец. Цяпер, калі нешта здараецца, нават па дробязях, стараюся прымаць пазіцыю спакойна, бо ён дарослы чалавек, і я не павінна ўлазіць у яго жыццё. Але застацца раўнадушнай не магу», — дзеліцца Ніна.

ТРЭБА СЯБЕ КАНТРАЛЯВАЦЬ

Ніна Савіна спецыялізуецца на самай старажытнай і, бадай, ці не самай складанай бегавой дысцыпліне — марафоне. Да старту дыстанцыі ў 42 кіламетры яна прыйшла паступова. Спачатку бегала розныя дыстанцыі, потым перайшла на 5 і 10 кіламетраў. Асвоіла іх і «прыбегла» да паўмарафонаў. А, скарыўшы паўмарафон, можна заглядваць і на марафон. «Проста так прабегчы марафон нельга. Для яго патрэбен пэўны ўзрост, схільнасць да марафону, фізіялагічныя асаблівасці арганізма. Нават калі ты пакарыў паўмарафон, не факт, што ты зможаш прабегчы марафон. Гэта абсалютна іншая дыстанцыя, удвая большая. Нават калі на марафоне ты прабяжыш 30 кіламетраў, гэта не значыць, што прабяжыш і астатнія 12. Проста нешта выключаецца, і нічога з такім станам зрабіць нельга. Можна сказаць, што сапраўдны марафон і пачынаецца пасля трыццатага кіламетра. Таму трэба разумець асаблівасці свайго арганізма і паступова падыходзіць да марафонскай дыстанцыі», — тлумачыць Ніна. Яна адзначае, што ў марафоне «забівае» не дыстанцыя, а тэмп: «Можна прайсці дыстанцыю нават непадрыхтаванаму чалавеку. Можна яе прабегчы, прайсці, прапаўзці. Пытанне — у якім тэмпе? Калі я пачну бегчы ў тэмпе, да якога не падрыхтаваная, я выключуся раней, чым дапаўзу да фінішу. Таму патрэбна правільна размяркоўваць свае сілы і адэкватна іх ацэньваць. Патрэбна сябе кантраляваць», — папярэджвае вопытная марафонка. Па словах Ніны, паўмарафону і яго дыстанцыі ў 21 кіламетр гэтая парада таксама датычыцца.

З кожным годам у краіне расце цікавасць да бегу. Адсюль і папулярнасць галоўнага сталічнага забегу.

Такія забегі трэніруюць не толькі выносліваць, але і навык кантраляваць свае цела і розум. І вельмі важная здольнасць — чуць самога сябе. «Я, калі выходжу на старт паўмарафону ці марафону, не проста бягу, як мне хочацца. Я дакладна ведаю, як я буду бегчы, ведаю свае задачы. Я заўсёды бягу па сваім графіку і сачу: адстаю я ад яго ці, наадварот, пераўзыходжу. Калі да 30 кіламетра дабягаеш і бачыш, што ўсё па графіку, то можна дадаваць тэмпу. А бываюць розныя сітуацыі. На марафоне ў Сайтама я бегла па графіку, але на 35 кіламетры мяне як прыбіла!.. Не магу — і ўсё тут. Але графік падчас забегу — галоўнае», — расказвае Ніна.

Ускладняе жыццё марафонцам і надвор'е, як гэта было, напрыклад, на Алімпійскіх гульнях у Токіа. «Мне той старт «не зайшоў». Не ведаю, што мне перашкодзіла. Магчыма, і спякота ўнесла свае карэктывы. Было вельмі горача. Наш старт перанеслі на гадзіну раней. Але ў шэсць гадзін раніцы ўжо было вельмі горача. У мужчын 20 чалавек сышлі з дыстанцыі, у нас толькі 15. Дзяўчаты аказаліся мацнейшымі. Канешне, я думала, што вынік будзе лепшы. Але я перажыла і адпусціла ўсе эмоцыі. І вынесла патрэбныя ўрокі», — расказвае Ніна пра свае першыя Алімпійскія гульні.

Дзмітрый у свае 19 гадоў пра марафоны пакуль сур'ёзна не задумваецца. Спецыялізуецца на сярэдніх дыстанцыях. Максімум — размовы з трэнерам пра магчымасць калісьці паспрабаваць свае сілы ў марафоне. «Фарсіраваць падзеі тут нельга. Марафон — гэта ўзроставая дыстанцыя. Яе пачынаюць бегаць, каб быць фізічна і маральна падрыхтаванымі, пасля 30 гадоў. Ну, я раней пачала», — заўважае Ніна. Цяпер у планах Дзмітрыя — паспрабаваць пакарыць дыстанцыю ў дзесяць кіламетраў.

СВЯТА, ВАРТАЕ ЎВАГІ

У апошнія гады бегавая культура становіцца ўсё больш папулярнай у Беларусі. Дзякуй за гэта варта сказаць і Мінскаму паўмарафону, і бегунам, якія годна выступаюць на міжнародных спаборніцтвах. Але не ўсе разумеюць, што бег можа быць сур'ёзным заняткам. «Былі людзі, якія казалі мне: «Ты вось бегаеш, а прафесіі ніякай не маеш». Ва ўсіх розныя ўяўленні. Далёкім ад спорту людзям цяжка растлумачыць, што ў мяне абсалютна нармальная работа», — заўважае Дзмітрый. Але, як адзначаюць брат і сястра, на вуліцах Бабруйска становіцца ўсё больш бегуноў. Дзмітрый упэўнены, што не ўсе правільна пачынаюць бегаць, таму і хутка заканчваюць. «Навошта пачынаць адразу бегчы? Можна пачаць з хуткай хады. Крыху прабег — прайшоўся, і паступова пачынай бегаць больш. А то некаторыя вельмі хутка стартуюць, пачынаюць балець ногі, спіна, яшчэ нешта. І заканчваюць. Паступова трэба», — дае параду Дзмітрый.

І так паступова можна прыйсці і да рэгістрацыі на Мінскі паўмарафон. Менавіта ён — паказчык таго, наколькі ў краіне развітая бегавая культура. Ніна адзначае, што з кожным годам у краіне расце цікавасць да бегу. Адсюль і папулярнасць галоўнага сталічнага забегу. «Для мяне Мінскі паўмарафон — адзін з самых значных стартаў. Я там усталявала рэкорд. Я яго выйграла, а мне важны такі вынік, паколькі гэта мая прафесія», — дзеліцца Ніна. У 2019 годзе яна першая прыбегла да фінішу дыстанцыі 21 кіламетр з вынікам 1 гадзіна 11 хвілін 24 секунды і ўстанавіла рэкорд трасы.

Ніна папярэджвае, што траса мінскага забегу зусім не простая. «Яе можна прабегчы. Пытанне — з якім тэмпам і якой падрыхтоўкай. Акрамя бегавой, там яшчэ патрэбна і сілавая падрыхтоўка. Не ўсе вытрымліваюць гэтыя пад'ёмы і спускі», — тлумачыць Ніна. Згаджаецца з сястрой і Дзмітрый. Ён пакуль пакарае толькі 5 кіламетраў. І нават самая малая дыстанцыя Мінскага паўмарафону патрабуе сіл і падрыхтоўкі. Але на пытанне, ці варта ўдзельнічаць у паўмарафоне, брат і сястра адказваюць адназначна: варта, трэба толькі падысці да яго з галавой.

Валерыя СЦЯЦКО.

Парады бегунам ад бегуноў

«Усё залежыць ад дыстанцыі. Калі гэта 21 кіламетр, то трэба ўзяць спакойны тэмп і нікуды не ляцець. На такіх масавых забегах многія рэзка стартуюць, сто метраў прабягаюць і ўсё. А трэба спакойна. На пунктах харчавання можна паесці, але калі адчуваеце сябе добра, гэта неабавязкова. Ваду ж па два глыткі трэба піць абавязкова», — раіць Ніна ўсім, хто плануе пакарыць галоўную дыстанцыю Мінскага паўмарафону.

Дзмітрый адзначае, што бегчы з галавой трэба і на пяці кіламетрах. Гэта дыстанцыя заўсёды самая папулярная. «Для многіх важна свята, а не сам забег. Таму многія бягуць толькі дзеля фота. А тым, хто хоча прабегчы, трэба рабіць гэта спакойна», — адзначае Дзмітрый.

Спартсмены далі каштоўную параду ўсім бегунам: «Калі ты бяжыш і можаш размаўляць — значыць, бяжыш у камфортным для сябе тэмпе. А калі размаўляць не можаш — трэба збаўляць тэмп». Цішэй едзеш — далей будзеш, упэўнены яны. І самая каштоўная парада — атрымаць задавальненне ад бегу і палюбіць яго.

АФГАНСКАЯ ХВАЛЯ

Чаму разгарнуўся глабальны міграцыйны крызіс?



ЗША і краіны міжнароднай кааліцыі вывелі войскі з Афганістана — «дэдлайн» быў вызначаны на 31 жніўня. Байцы «Талібана» ўвайшлі ў аэрапорт Кабула зранку ў аўторак. Шмат хто з іх былі ў кінутай амерыканскай экіпіроўцы, паведаміла Бі-бі-сі. Пасля таго як заходнія ваенныя пакінулі краіну, там засталіся тыя, хто дапамагаў міжнародным сілам, працаваў на іх або на ўрад, які зрынулі талібы. ЗША і іншыя краіны кааліцыі напярэдадні заявілі, што не змогуць эвакуіраваць усіх ахвотных, у прыватнасці, з-за сітуацыі ў аэрапорце Кабула і шчыльна перакрытых з-за пандэміі і тэрарыстычнай пагрозы сухапутных граніц. За сваю гісторыю Афганістан перажыў некалькі глабальных хваль міграцыі. Чым адметная цяперашняя шматтысячная плынь бежанцаў?

З хаосу ў нявызначанасць

Захоп талібамі Кабула спарадзіў праблему сусветнага маштабу. У Еўропе і Амерыцы вырашаюць, што рабіць з бежанцамі з Афганістана. Чаканая хваля вымушаных перасяленцаў з гэтай шматпакутнай краіны, як не без падстаў асцерагаюцца ў Еўрасаюзе, можа стварыць новы міграцыйны крызіс, параўнальны з тым, што не так даўно выклікалі бежанцы ад наступстваў «арабскай вясны», заўважыў expert.ru. Масавая эвакуацыя з Кабула пачалася ўжо 14 жніўня, калі талібы імкліва захапілі практычна ўсю краіну і стаялі каля Кабула. Генерал Кенэт Макензі, кіраўнік Цэнтральнага камандавання, які адказвае за амерыканскія ваенныя аперацыі ў рэгіёне, паведаміў, што за 17 дзён самалёты ЗША і іх саюзнікаў эвакуіравалі звыш 123 тысяч мірных жыхароў — у сярэднім больш чым 7500 грамадзянскіх асоб штодня.

Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш заклікаў усе краіны прымаць бежанцаў з Афганістана і не дэпартаваць іх. «Наступныя дні будуць вырашальнымі. Свет глядзіць на нас. Мы не можам і не павінны пакідаць у бядзе народ Афганістана», — заўважыў генсек. Толькі з хаосу людзі трапілі ў поўную нявызначанасць: многія дагэтуль знаходзяцца на ваенных базах ЗША ў трэціх краінах і не ведаюць, што будзе з імі далей. Штаты паабяцалі прыняць 22 тысячы бежанцаў. Часовае рашэнне па іх размяшчэнні — лагер на тэрыторыі Форта МакКой, ваеннага гарнізона ў штаце Віскансін, а таксама аналагічны лагер Форт Бліс у Тэхасе.

План выглядаў бы рэалістычным, калі б ужо цяпер не было зразумела: больш за 88 тысяч афганцаў, якія супрацоўнічалі з ЗША ў Афганістане, падалі дакументы на атрыманне спецыяльных віз. Такую лічбу раней агучыў Бі-бі-сі прадстаўнік Дзярждэпа, прычым гэта не лічачы членаў іх сем'яў. Колькі людзей насамрэч апынецца ў ЗША — пытанне адкрытае. Справа ў тым, што Вашынгтон вядзе перагаворы аб размяшчэнні бежанцаў у трэціх краінах. Часова прыняць людзей, асабістыя справы якіх апрацоўвае ЗША, пагадзіліся Албанія, Канада, Калумбія, Коста-Рыка, Чылі, Косава, Паўночная Македонія, Мексіка, Польшча, Катар, Руанда і Уганда (і без таго самая вялікая па колькасці бежанцаў афрыканская краіна).

Піва замест бежанцаў

Вялікабрытанія гатовая прыняць да 20 тысяч бежанцаў з Афганістана. Прыярытэт будзе аддавацца жанчынам і дзецям, якія апынуліся ў сённяшнім Афганістане ў найбольш хісткім становішчы. «Гэтыя загалоўкі ў медыя — пра 20 тысяч чалавек — гучалі вельмі прывабна. Але калі ўчытацца, то становіцца зразумела, што ў першы год Брытанія прыме толькі пяць тысяч, а потым урад ацэніць сітуацыю і прыме далейшае рашэнне», — заўважыў iz.ru Махамад Азіф, кіраўнік афганскага фонду захавання правоў чалавека, які базіруецца ў Глазга.

Такую ж колькасць — 20 тысяч чалавек — вырашыла прыняць і Канада. Зрэшты, як сцвярджаюць мясцовыя журналісты, у рэальнасці гэтая лічба ўжо была прапісаная ў гадавым плане па прыёме ўсіх бежанцаў, а цяпер гэтыя квоты проста размеркавалі на карысць афганцаў. Тым жа чынам «схітравала» і Аўстралія, якая прапанавала тры тысячы месцаў у рамках сваёй гуманітарнай візавай праграмы. І, як пацвердзілі iz.ru ў прэс-службе аўстралійскага міністэрства замежных спраў і гандлю, агульная колькасць такіх віз для замежнікаў Канбера павялічваць не будзе.

Суседзі Афганістана — Пакістан, дзе, паводле інфармацыі ўпраўлення вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ), да канца мінулага года знаходзілася каля 1,5 мільёна афганцаў, і Іран, які ўжо прытуліў 780 тысяч перасяленцаў, — заявілі, што больш пускаць да сябе нікога не будуць. Турцыя, куды збеглі амаль 130 тысяч афганцаў і чый лідар Рэджэп Эрдаган прама заявіў, што краіна не стане «сховішчам мігрантаў у Еўропе», пачала ўдарнымі тэмпамі ўзводзіць сцяну на граніцы з Іранам, каб не пускаць бежанцаў.

Тым жа шляхам пайшла і Грэцыя (на канец мінулага года там ужо было звыш 41 тысячы афганцаў), усталяваўшы 40-кіламетровы плот і сістэму назірання на граніцы з Турцыяй, каб спыніць далейшы наплыў мігрантаў. Ніякага жадання прыняць бежанцаў не выказалі і іншыя краіны Еўрасаюза, у якім, паводле даных Statista, пастаянны або часовы прававы статус сёлета ў першым квартале атрымала каля сямі тысяч афганцаў.

Расследаванне, праведзенае газетай Bild, паказала, што падчас эвакуацыі з Афганістана сваіх ваенных Германія адмовіла ў візах сотням афганцаў, якія працавалі з імі. Замест іх верталёты бундэсвера павезлі на радзіму 340 бутэлек віна і 65 тысяч бляшанак піва. Гэтую «піўную эвакуацыю» прэса назвала ганебнай. Германія абмежавалася прапановай вылучыць €100 млн тэрміновай фінансавай дапамогі міжнародным арганізацыям, якія будуць дапамагаць афганскім бежанцам у суседніх краінах.

А іншыя проста сказалі «не». Францыя вуснамі прэзідэнта Эмануэля Макрона заявіла, што Еўропе перш за ўсё трэба «абараніць сябе ад значных хваль нелегальных мігрантаў» з Афганістана. Аўстрыя зноў вылучыла ідэю стварыць цэнтры для бежанцаў за межамі ЕС, паабяцаўшы дэпартаваць усіх нелегалаў, нягледзячы на сітуацыю ў Афганістане. Адхрысцілася ад вялікай колькасці бежанцаў і Швейцарыя, выказаўшы гатоўнасць прыняць толькі 230 чалавек, якія працавалі са швейцарскімі арганізацыямі ў Афганістане.

«Цёплы» прыём

Еўрасаюз мае намер не дапусціць наплыву афганскіх бежанцаў. У заяве кіраўнікоў МУС краін ЕС па выніках экстраннай нарады ўказваецца, што абарону гэтым людзям варта забяспечыць у суседніх з Афганістанам краінах, паведаміла dw.com. Краіны ЕС не змаглі дамовіцца аб агульным падыходзе да прыёму бежанцаў, якія апынуліся ў небяспецы пасля захопу ўлады талібамі. Еўрасаюз не хоча браць на сябе ніякіх канкрэтных абавязацельстваў па гэтым пытанні. Еўрапейскія ўлады па прыкладзе ЗША шукаюць варыянты спыніць афганскую хвалю бежанцаў за межамі ЕС. З'явілася інфармацыя, што яны маюць намер прапанаваць краінам — суседзям Афганістана — фінансавую дапамогу ў памеры 600 мільёнаў еўра, каб тыя размясцілі ў сябе бежанцаў з гэтай дзяржавы. Пра гэта са спасылкай на афіцыйных асоб у Бруселі паведаміла Financial Times.

— Сітуацыя застаецца нестабільнай. Любы буйны прыток бежанцаў, відавочна, запатрабуе ад міжнароднай супольнасці неадкладнай і ўстойлівай падтрымкі як Афганістана, так і яго суседзяў у духу падзелу адказнасці. Пашырэнне бяспечных шляхоў для бежанцаў у Еўропу, уключаючы перасяленне, таксама можа забяспечыць рэалістычныя і значныя альтэрнатывы незаконнаму ўвозу людзей і нерэгулярным перамяшчэнням у якасці кіраванага і доўгатэрміновага адказу, — адзначыў iz.ru прадстаўнік УВКБ ААН па справах ЕС Мэв Патэрсан.

У тым, што адбываецца на практыцы, пераканаўся на свае вочы прадстаўнік УВКБ ААН у Беларусі Мулусеу Мамо, які наведаў участак пагранічнай заставы «Русакі» Гродзенскай пагранічнай групы для азнаямлення з сітуацыяй, якая складваецца на граніцы. Пра гэта БелТА паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце. «Падчас мерапрыемства беларускі бок акрэсліў сваю пазіцыю, а таксама даў магчымасць пагутарыць з грамадзянамі Афганістана, якія знаходзяцца на лініі граніцы ўжо працяглы час, — адзначылі ў ДПК. — Замежнікі расказалі прадстаўніку УВКБ ААН, чаму яны пакінулі свае дамы ў Афганістане і навошта хочуць трапіць у краіны Еўропы, а таксама як польскі бок падманным шляхам даставіў іх да лініі граніцы, нягледзячы на іх спробу звярнуцца па сховішча ў Польшчы».

Мігранты вельмі абураныя тым фактам, што польскія вайскоўцы не дапускаюць да іх прадстаўнікоў еўрапейскіх СМІ і праваахоўных арганізацый для аказання дапамогі. Замежнікі адкрыта заявілі пра свой намер трапіць у краіны ЕС. «Раней беларускі бок неаднаразова заклікаў міжнародныя і гуманітарныя арганізацыі аб'ектыўна разабрацца з фактамі парушэнняў правоў чалавека і бежанцаў з боку еўрапейскіх краін, а таксама аказаць ім прававую і іншую дапамогу ў рамках выканання сваіх абавязацельстваў», — адзначылі ў ДПК.

Раней пагранічнікі заставы Бігосава Полацкага пагранатрада спынілі чарговую спробу незаконнага выяснення мігрантаў з тэрыторыі Латвіі на тэрыторыю Беларусі. У прыватнасці, супрацоўнікі латвійскай Дзяржпагранаховы з прымяненнем фізічнай сілы на лінію дзяржграніцы даставілі 21 грамадзяніна Афганістана, з іх 11 дзяцей», — расказалі ў ДПК. Мігранты растлумачылі пагранічнікам, што прыбылі ў Латвію ў пошуках лепшых умоў жыцця з мэтай далейшага руху ў Германію. Пасля затрымання латвійскімі пагранічнікамі яны ўтрымліваліся ў дрэнных умовах, лекамі і гарачым харчаваннем не забяспечваліся, нават просьба забяспечыць малаком маленькіх дзяцей засталася па-за ўвагай. Пасля, нягледзячы на заявы аб атрыманні статусу бежанца, падманным шляхам усю групу даставілі на граніцу з Беларуссю, заявіўшы, што Латвія бежанцаў не прымае і іх чакаюць аўтамабілі, якія адвязуць у Германію.

Толькі разам

Днямі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў некалькі тэлефонных размоў: з Прэзідэнтамі Таджыкістана, Расіі і Узбекістана. Асноўная тэма кансультацый напярэдадні пасяджэння АДКБ, якое пройдзе 16 верасня ў Душанбэ, — сітуацыя ў Афганістане. А 16—17 верасня ў сталіцы Таджыкістана адбудзецца саміт ШАС. Як адзначыў Прэзідэнт Беларусі падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Таджыкістана ў Беларусі Махмадшарыфам Хакдодам, усе суразмоўцы пагадзіліся з прапановай правесці кансультацыі па Афганістане па лініі АДКБ — ШАС і паглядзець, якую пазіцыю зойме па тэме ШАС.

— Калі пазіцыя ШАС і АДКБ будзе кансалідаванай, то мы з гэтай сітуацыяй справімся. Дапаможам і афганскаму народу пераадолець гэтыя цяжкасці. Калі на афганскай «скрыпцы» кожны будзе іграць па-свойму, быць бядзе. Гэта няпросты рэгіён. І пытанне не толькі ў Афганістане, няпростая сітуацыя і ў суседніх краінах, на Блізкім Усходзе. Радыкалізм сёння, на жаль, мае і аб'ектыўныя асновы і прычыны для такіх паводзін», — заўважыў Прэзідэнт Беларусі.

Беларускі лідар упэўнены, што нагода для радыкалізму — умяшанне вядучых заходніх краін у гэтыя раёны, стварэнне там больш горшай сітуацыі, чым была. «І зразумела, яны спарадзілі большы радыкалізм. Хто ў гэтым вінаваты? Яны і вінаватыя», — лічыць беларускі лідар.

Захар БУРАК.

ДАРОЖНАЯ КАРТА ВЁСКІ ГРЫЦКІ

Пра населены пункт, які ўражвае сваім дагледжаным і прывабным выглядам

Калі падчас камандзіровак выязджаю за межы раённых цэнтраў і аграгарадкоў, міжволі звяртаю ўвагу на старыя дамы, ад якіх сведчыць аб запусценні і адсутнасці гаспадароў. Калі такіх дамоў трапляе на вочы больш за дзясятак, зразумела, што ў вёсцы не вельмі пазітыўныя перспектывы. Між тым ёсць і іншыя прыклады. Менавіта адзін з такіх населеных пунктаў давялося не так даўно праязджаць у Свіслацкім раёне. Вадзіцель райвыканкама, з якім мы ехалі праз яго вёску Грыцкі, заўважыў: «Вы ведаеце, што з нашай вёскі ніхто не з'язджае?»

Жыхарка Грыцкоў Людміла ЛЯХ.

Пакінуць такі факт без увагі было проста немагчыма. Сапраўды, як так? Адусюль з'язджаюць, а з Грыцкоў — не. Пазней аказалася, што з'язджаюць і адсюль. Але дамы хутка раскупляюцца. Таму населены пункт не губляе свайго рэспектабельнага выгляду.

Наколькі форма адпавядае зместу, ці папросту — чаму месцічам так даспадобы гэтая вёска, вырашаю паціка вацца ў іх самих. Але перш адзначаю некаторыя станоўчыя фактары, што бачныя нават старонняму чалавеку. Адзін з іх — асфальтаваная дарога, якая вядзе да райцэнтра. Некалькі добраўпарадкаваных аўтобусных прыпынкаў з раскладам руху. Прыгожыя агароджы, за якімі дагледжаныя сядзібы з кветнікамі, газонамі і дэкаратыўнымі раслінамі. Не відаць хат-развалюх.

Кіроўца Іван Станіслававіч спыняецца на ўскрайку якраз каля жанчыны з роварам. Знаёмімся. Аказалася, што Людміла Іванаўна Лях вывела на пашу сваіх кароў. Іх у яе чатыры, а не так даўно было восем. Праўда, яна — адзіная на вёсцы, хто трымае рагуляў і, відаць, будзе і надалей скарачаць сваё пагалоўе. Але здаваць малако выгадна, кажа жанчына. І самім хапае, і зарабіць можна. Літар малака прымаюць за 56 капеек. Кармы нарыхтоўваюць самі, а салому можна выпісаць у сельгаспрадпрыемстве.

Цікаўлюся, як вёска выжывае ў век урбанізацыі. Не сакрэт, што моладзь з'язджае, а дэмаграфічная сітуацыя наўрад ці паляпшаецца, хутчэй, наадварот. Вось і яе дачка выйшла замуж за аднавяскоўца і жыве ў Свіслачы. Але тут сапраўды, кажа Людміла Іванаўна, ніколі не было праблем з пустымі дамамі. Магчыма, ад таго, што вёска зусім блізка да райцэнтра — усяго за некалькі кіламетраў. Калі хто і з'язджае адсюль, дамы хутка раскупляюць. Некаторыя прыязджаюць на сталае пражыванне, некаторыя выкарыстоўваюць пад лецішчы. Можна набыць дом і за 3—5 тысяч долараў. А ёсць і значна даражэйшыя. Такая цана, як аказалася, далёка не ўсюды.

— У больш аддаленых вёсках выдатныя дамы стаяць, а гаспадары вымушаны іх за бясцэнак прадаваць, каб зусім не зніклі. Напрыклад, у Ражках, суседняй вёсцы, дом прадалі з усімі выгодамі і лазняй усяго за 3,5 тысячы долараў. Бацькоў не стала, а дочкі жывуць у Гродне. Каля пушчы нямала дамоў прадаецца. Калісьці будавалі з добрага лесу, але гэта далекавата — кіламетраў 30—40 ад райцэнтра, таму і попыт там нізкі. Некаторыя перавозяць дамы з аддаленых вёсак у аграгарадкі ці больш населеную вёску, — тлумачыць Людміла Іванаўна.

Сама жанчына прыехала сюды гадоў 40 таму з Віцебскай вобласці па размеркаванні, тут выйшла замуж і засталася. Яна пагаджаецца з тым, што кожны гаспадар добра даглядае сваю сядзібу, таму і агульны выгляд населенага пункта прывабны. Якраз падчас размовы работнік ці то ЖКГ, ці то сельскага Савета абкошваў касілкай тэрыторыю каля дарогі. Жанчына лічыць, што гэта варта рабіць і самім гаспадарам сядзіб, а работнікаў лепш накіраваць на пакос сумніку, які зараз вядзе наступленне на пашу.

Увосень і ўзімку жыхароў у вёсцы будзе менш, бо многія з'едуць у горад. Але немалая колькасць застанецца. Як паведамілі ў Свіслацкім сельвыканкаме, у 70 дамах населенага пункта пастаянна пражывае каля паўсотні чалавек. Зараз будуюцца яшчэ дзве сям'і. У наступным годзе вёску будуць газіфікаваць. Жыхары аплацяць 30 % кошту работ, астатнія 70 % датуе дзяржава. Праўда, у вёсцы няма крамы, але гэта акалічнасць не вельмі засмучае жыхароў, бо сюды два разы на тыдзень ездзіць аўталаўка, ды і да горада недалёка.

Блізкасць райцэнтра, вядома не на апошнім месцы ў прывабнасці вёскі. Дарэчы, у такім стане не толькі Грыцкі. Па словах **старшыні Свіслацкага сельвыканкама Сяргея МАРКУШЭЎСКАГА,** у вёсках, якія акальцоўваюць райцэнтр, праблема пустых дамоў не стаіць. Такія пытанні прыходзіцца вырашаць у аддаленых населеных пунктах.

Сядзібы вёскі.

— На сёння мы працуем па такім прынцыпе: не чакаем, пакуль пройдзе паўгода пасля смерці гаспадара. Пытаемся ў будучых нашчадкаў аб спосабе выкарыстання сядзібы. Ці ён сам будзе даглядаць дом, ці мае намер яго прадаваць. У апошнім выпадку сельвыканкам дапаможа выставіць дом на продаж праз аўкцыён. Таксама гаспадар можа прадаць яго самастойна. Некаторыя пішуць заяву з просьбай знесці дом. Ёсць спадчыннікі, якія не даюць інфармацыю аб выкарыстанні дома, але такіх мала. Як правіла, большаць ведае, як распарадзіцца маёмасцю, — расказаў алгарытм дзеянняў Сяргей Маркушэўскі.

Прадстаўніка мясцовай улады задавальняе той факт, што ідзе пастаяннае ўдасканаленне заканадаўчай базы па вырашэнні лёсу старых і пустых дамоў. З пачатку будучага года цалкам уступіць у дзеянне Указ № 116 «Аб адчужэнні жылых дамоў у сельскай мясцовасці і ўдасканаленні работы з пустымі дамамі». Гэта дазволіць спрасціць работу з нашчадкамі і дасць магчымасць папоўніць мясцовы бюджэт.

— Мы па рашэнні абласных улад склалі рэестр населеных пунктаў, у якіх можна прадаваць дом за адну базавую велічыню, а ў якіх — даражэй. Гэта ўсё рэгламентуецца новым указам, які пакуль не ўступіў у дзеянне ў поўным аб'ёме, — адзначыў старшыня сельвыканкама. — Такі расклад спрыяльны для пакупніка, бо можна набыць дом за адну базавую велічыню. І калі людзі аб гэтым пачулі, яны чакаюць. Але гэта не значыць, што попыт знізіўся. У параўнанні з мінулымі гадамі ён расце. Асабліва цяпер, калі людзі даведаліся, што можна будзе набыць дом за адну базавую.

Гэта датычыцца ў асноўным найбольш аддаленых населеных пунктаў. Тое, што карыстаецца попытам, будзе даражэй. Улічваецца і наяўнасць інфраструктуры. Цяпер відавочная тэндэнцыя набыцця вясковых дамоў пад дачы. І гэта нядрэнна, лічаць у сельвыканкаме. Галоўнае, што сядзіба будзе мець гаспадара і даглядацца. Сёння кожны хоча адпачыць у цішы, паблізу прыроды. Многія яшчэ любяць чымсьці займацца, майстраваць, нешта вырошчваць.

Па словах старшыні Свіслацкага сельвыканкама, на тэрыторыі сельскага Савета пустых дамоў няшмат — каля 25. Некаторыя прадаюцца самімі нашчадкамі. Цана залежыць ад стану дома.

Пазней я пацікавілася продажам дамоў у Грыцках. Знайшла дзве прапановы. І абедзве — дамы катэджнага тыпу з добраўпарадкаваннем, усімі выгодамі, прыгожымі сядзібамі і гаспадарчымі пабудовамі. Адзін прадаецца за 17 тысяч умоўных адзінак, а другі — за 32 тысячы. Наўрад ці гаспадары выставілі такую высокую цану, калі б вёска не была прывабнай для жыцця.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.
Свіслацкі раён.

Эканамікс

І СОТНІ НОВЫХ РАБОЧЫХ МЕСЦАЎ

На плошчах былога прамысловага гіганта ў Брэсце інвестар стварыў мэблевую вытворчасць

Брэсцкі завод «Цветатрон» на пачатку сваёй гісторыі знаходзіўся ў шэрагу паспяховых прадпрыемстваў былога Саюза. Узведзены ў самым пачатку 1980-х гадоў, завод спецыялізаваўся на вытворчасці ваеннай электронікі і кінескопаў для тэлевізійных прыёмнікаў. Потым быў перапрафіляваны на выпуск грамадзянскай электронікі. Але пасля развалу былой вялікай краіны прадпрыемства паступова памяншалася і прыходзіла ў заняпад.

Фота БелТА.

Калі ў лепшыя гады на заводзе працавала каля шасці тысяч чалавек і сюды нават была пракладзена адна з першых у горадзе тралейбусных ліній, то ў 2016 годзе колькасць працоўных ледзь перавысіла дзве сотні. Вядома, аграмадныя плошчы завода засталіся незапатрабаванымі. Пра маштабы прадпрыемства згадвалі яго былыя супрацоўнікі. Паводле іх слоў, з аднаго цэха ў другі часам ездзілі веласіпедамі.

Завод не толькі пусцеў унутры, ён станавіўся непрывабным звонку, з-за недахопу сродкаў не праводзілася належнае добраўпарадкаванне, і тэрыторыя паступова станавілася праблемным момантам для гарадской гаспадаркі. Таму прыход інвестара — замежнага таварыства з абмежаванай адказнасцю «АНРЭКС» — аказаўся чаканым.

Названае прадпрыемства па выпуску корпуснай мэблі ў горадзе над Бугам не новае, ужо чвэрць стагоддзя яно з'яўляецца рэзідэнтам свабоднай эканамічнай зоны «Брэст», і ў студзені мінулага года кампанія набыла ў завода «Цветатрон» памяшканні плошчай 41 тысяча квадратных метраў. Запланавана іх паэтапная рэканструкцыя і ўвод у строй. Усяго ў праект плануецца інвеставаць 60 мільёнаў рублёў і стварыць каля 500 рабочых месцаў. Першы вытворча-складскі комплекс ужо здадзены, там запушчаны працэс вытворчасці. На яго ўрачыстае адкрыццё прыехалі кіраўнікі горада і вобласці.

— Горад атрымаў будынак з прыгожым архітэктурным вырашэннем і пазбавіўся ад нерэнтабельных карпусоў былога завода, — сказаў у прывітальным слове **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.** — Адкрыццё новай вытворчасці стала добрым унёскам у развіццё эканомікі абласнога цэнтра.

Кіраўнік рэгіёна падкрэсліў, што ў эканоміку прыйшло яшчэ адно паспяховае прадпрыемства з сярэдняй зарплатай супрацоўнікаў, якая крыху перавышае 1200 рублёў. Многія гараджане атрымалі стабільную работу, прыстойную заработную плату і сацпакет. Інвестар укладвае значныя сумы ў сродкі вытворчасці, апошняе становіцца гарантыяй таго, што вытворчасць будзе і надалей развівацца.

Кіраўнік адміністрацыі СЭЗ «Брэст» Фёдар КАЛАНЧУК расказаў журналістам, што ў 2016 годзе быў прыняты заканадаўчы акт, якім дазволена пашырэнне тэрыторыі СЭЗ. І прадпрыемствы, што маюць свабодныя плошчы, увайшлі туды. За гэты час удалося задзейнічаць каля 136 тысяч квадратных метраў. Многія кампаніі свабоднай эканамічнай зоны скарысталіся пляцоўкамі электралямпавага, электрамеханічнага заводаў, дывановага камбіната. За пяць гадоў на плошчах былых прамысловых гігантаў размясцілася каля 80 прадпрыемстваў.

Кампанія «АНРЭКС» стала рэзідэнтам СЭЗ «Брэст» у канцы 90-х. Яна займаецца выпускам корпуснай мэблі для гасцінных, спальняў, пярэдніх пакояў і кабінетаў. На экспарт рэалізоўваецца каля 75 працэнтаў прадукцыі. Усяго мэбля адгружаецца ў 13 краін свету. Найбольш — у Польшчу, Расію, Казахстан, Літву. За час дзейнасці прадукцыі выпушчана на 330 мільёнаў долараў.

Цяпер у кампаніі працуе крыху больш за 800 чалавек. З уводам у строй другой і трэцяй чэргаў у былых памяшканнях «Цветатрона» яшчэ некалькі соцень чалавек атрымаюць работу.

Генеральны дырэктар «АНРЭКС» Наіль ШАМСУТДЗІНАЎ адзначыў, што пачынаючы з 2012 года на прадпрыемствах кампаніі праходзіць поўная і планамерная мадэрнізацыя цэхаў і вытворчых працэсаў. Набываюцца найноўшыя машыны і абсталяванне. Таму прадукцыя выпускаецца канкурэнтаздольнай і карыстаецца стабільным попытам у спажыўца.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ ТОРГОВ

Организатор торгов	**Антикризисный управляющий Открытого акционерного общества «МОТОВЕЛО» – ООО «Антикризисное управление», 220012, Минск, ул. Чернышевского, д. 5, офис 4, сектор «Б»**
Продавец	**ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. +375 17 298-14-22)**

Торги проводятся в форме открытого аукциона отдельными лотами на повышение стоимости с открытой формой предложения

Сведения о предмете торгов и начальной цене

Дебиторская задолженность:

Лот № 1: АНТОНОВИЧ ЕЛЕНА ВЛАДИМИРОВНА ИП (УНП 192636417) на сумму 27,60 руб., начальная цена – 13,80 руб.

Лот № 4: Закрытое акционерное общество «БайкСет» (УНП 790258178) на сумму 5 482,57 руб., начальная цена – 2 741,29 руб.

Лот № 5: Закрытое акционерное общество «БайкСет» (УНП 790258178) на сумму 5 841,51 руб., начальная цена – 2 920,76 руб.

Лот № 6: Закрытое акционерное общество «БайкСет» (УНП 790258178) на сумму 11 143,02 руб., начальная цена – 5 571,51 руб.

Лот № 7: Открытое акционерное общество «Белвторчермет» (УНП 100071565) на сумму 0,01 руб., начальная цена 0,01 руб.

Лот № 8: Открытое акционерное общество «Белвторчермет» (УНП 100071565) на сумму 5 186,83 руб., начальная цена 2 593,42 руб.

Лот № 9: Открытое акционерное общество «БЕЛОРУССКАЯ УНИВЕРСАЛЬНАЯ ТОВАРНАЯ БИРЖА» (УНП 190542056) на сумму 25,50 руб., начальная цена – 12,75 руб.

Лот № 10: Открытое акционерное общество «Белпромимпэкс» (УНП 100088681) на сумму 0,10 руб., начальная цена 0,05 руб.

Лот № 11: Открытое акционерное общество «Белпромимпэкс» (УНП 100088681) на сумму 4,00 руб., начальная цена 2,00 руб.

Лот № 12: Транспортное республиканское унитарное предприятие «МИНСКОЕ ОТДЕЛЕНИЕ БЕЛОРУССКОЙ ЖЕЛЕЗНОЙ ДОРОГИ» (УНП 100003499) на сумму 30,61 руб., начальная цена 15,31 руб.

Лот № 13: Общество с дополнительной ответственностью «БМТ компани» (УНП 190829691) на сумму 55,20 руб., начальная цена 27,60 руб.

Лот № 14: Общество с ограниченной ответственностью «БоксСервис» (УНП 191046051) на сумму 0,06 руб., начальная цена 0,03 руб.

Лот № 15: Общество с ограниченной ответственностью «Вамакс Трейд» (УНП 191443294) на сумму 108,00 руб., начальная цена 54,00 руб.

Лот № 16: Общество с ограниченной ответственностью «Вамакс Трейд» (УНП 191443294) на сумму 25,50 руб., начальная цена 12,75 руб.

Лот № 18: Частное производственное унитарное предприятие «Виват Инвест Пром» (УНП 191819883) на сумму 193,20 руб., начальная цена 96,60 руб.

Лот № 20: Общество с ограниченной ответственностью «Гелиймаш» (УНП 193337016) на сумму 165,60 руб., начальная цена – 82,80 руб.

Лот № 22: Гаражно-строительный потребительский кооператив «Мотовело № 22» (УНП 101165929) на сумму 22,52 руб., начальная цена – 11,26 руб.

Лот № 23: Гаражно-строительный потребительский кооператив «Мотовело № 22» (УНП 101165929) на сумму 3,00 руб., начальная цена – 1,50 руб.

Лот № 24: ИП Гузовская Юлия Борисовна (УНП 190731962) на сумму 55,20 руб., начальная цена – 27,60 руб.

Лот № 25: Общество с ограниченной ответственностью «ДВ-Сервис плюс» (УНП 691803992) на сумму 30,90 руб., начальная цена – 15,45 руб.

Лот № 26: Общество с ограниченной ответственностью «ДЕЛЬТАБЕТОНСТРОЙ» (УНП 692165648) на сумму 57,41 руб., начальная цена – 28,71 руб.

Лот № 27: Иностранное частное торговое унитарное предприятие «ЕВРОКРЕПЕЖ» Зыгмунда Гвоздовича (УНП 800014103) на сумму 1,98 руб., начальная цена – 0,99 руб.

Лот № 28: Общество с ограниченной ответственностью «ЕВРОЛАМИНАТ» (УНП 808000727) на сумму 2,00 руб., начальная цена – 1,00 руб.

Лот № 29: Производственное коммунальное унитарное предприятие «Жилкомплект» (УНП 100984075) на сумму 3,51 руб., начальная цена – 1,76 руб.

Лот № 30: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 5 110,08 руб., начальная цена – 2 555,04 руб.

Лот № 31: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 227,74 руб., начальная цена – 113,87 руб.

Лот № 32: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 64,94 руб., начальная цена – 32,47 руб.

Лот № 33: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 553,54 руб., начальная цена – 276,77 руб.

Лот № 34: Общество с ограниченной ответственностью «Интерремтехник» (УНП 790303647) на сумму 872,73 руб., начальная цена – 436,37 руб.

Лот № 36: КАЧАНОВ ВЛАДИСЛАВ ЮРЬЕВИЧ на сумму 0,26 руб., начальная цена – 0,13 руб.

Лот № 37: Общество с ограниченной ответственностью «Компания Т2А» (УНП 192357199) на сумму 0,53 руб., начальная цена – 0,27 руб.

Лот № 41: Общество с ограниченной ответственностью «МаксПринт-Сервис» (УНП 191231033) на сумму 879,45 руб., начальная цена – 439,73 руб.

Лот № 45: Закрытое акционерное общество «Мотовело Эко» (УНП 191118437) на суммы 24 723,03 руб., начальная цена – 12 361,52 руб.

Лот № 46: Общество с ограниченной ответственностью «Мыльная Мануфактура» (УНП 191751312) на сумму 64,45 руб., начальная цена – 32,23 руб.

Лот № 47: Общество с ограниченной ответственностью «НаноКомпозит» (УНП 808001631) на сумму 72,00 руб., начальная цена – 36,00 руб.

Лот № 48: Партизанский (г.Минска) отдел Департамента охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь (УНП 100349886) на сумму 57,31 руб., начальная цена – 28,66 руб.

Лот № 49: Открытое акционерное общество «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (УНП 600012322) на сумму 144,00 руб., начальная цена – 72,00 руб.

Лот № 50: Закрытое акционерное страховое общество «Промтрансинвест» (УНП 100357923) на сумму 0,02 руб., начальная цена – 0,01 руб.

Лот № 51: Закрытое акционерное общество «МВЗ РамСтил» (УНП 191118386) на сумму 54,12 руб., начальная цена – 27,06 руб.

Лот № 52: Закрытое акционерное общество «МВЗ РамСтил» (УНП 191118386) на сумму 12 721,04 руб., начальная цена – 6 360,52 руб.

Лот № 53: Закрытое акционерное общество «МВЗ РамСтил» (УНП 191118386) на сумму 44 449,56 руб., начальная цена – 22 224,78 руб.

Лот № 54: Закрытое акционерное общество «МВЗ РамСтил» (УНП 191118386) на сумму 132 191,67 руб., начальная цена – 66 095,84 руб.

Лот № 55: Государственное учреждение «Республиканский центр аналитического контроля в области охраны окружающей среды» (УНП 191220048) на сумму 24,72 руб., начальная цена – 12,36 руб.

Лот № 57: Общество с ограниченной ответственностью «Роспрокат» (УНП 192404446) на сумму 5,62 руб., начальная цена – 2,81 руб.

Лот № 58: Общество с ограниченной ответственностью «Спрайком» (УНП 192550884) на сумму 160,18 руб., начальная цена – 80,09 руб.

Лот № 59: Общество с ограниченной ответственностью «ТехноШок» (УНП 191700317) на сумму 306,00 руб., начальная цена – 153,00 руб.

Лот № 60: Иностранное частное торговое унитарное предприятие «Туркиш сладости «КОЧ» (УНП 191761605) на сумму 1 800,00 руб., начальная цена – 900,00 руб.

Лот № 62: Общество с ограниченной ответственностью «Фабрика нержавеющих конструкций» (УНП 691589787) на сумму 54,37 руб., начальная цена – 27,19 руб.

Лот № 63: Закрытое акционерное общество «МВЗ Фарбатек» (УНП 191118281) на сумму 372,00 руб., начальная цена – 186,00 руб.

Лот № 64: Общество с ограниченной ответственностью «ФЛАРС» (УНП 100161571) на сумму 20,80 руб., начальная цена – 10,40 руб.

Лот № 65: Общество с ограниченной ответственностью «Халенгер» (УНП 812006365) на сумму 55,20 руб., начальная цена – 27,60 руб.

Лот № 66: Закрытое акционерное общество «Чистый берег» (УНП 101489077) на сумму 3,60 руб., начальная цена – 1,80 руб.

Лот № 67: Торговое частное унитарное предприятие «ШАТЕ-М ПЛЮС» (УНП 190273406) на сумму 14,58 руб., начальная цена – 7,29 руб.

Лот № 68: Торговое частное унитарное предприятие «ЭЛЕКТРОКОНСТРУКЦИЯ» (УНП 190660315) на сумму 0,01 руб., начальная цена – 0,01 руб.

Лот № 69: Общество с ограниченной ответственностью «ЭТВ Вод» (УНП 192300445) на сумму 76,80 руб., начальная цена – 38,40 руб.

Лот № 70: Научно-производственное частное унитарное предприятие «АВИЦЕННА» (УНП 600068797) на сумму 1 393,60 руб., начальная цена – 696,80 руб.

Лот № 71: Научно-производственное частное унитарное предприятие «АВИЦЕННА» (УНП 600068797) на сумму 15 855,30 руб., начальная цена – 7 927,65 руб.

